

ЯК НЕ ЗАХАНДРЫЦЬ ВОСЕННЮ

5

ХТО Ў МАГІЛЁВЕ ЗДЫМАЎ ВЫДАТНАЕ КІНО

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ВЕРАСНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 175 (29797)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Развіццё прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў нашай краіне з'яўляецца адным з прыярытэтаў, таму што сёння для нашай эканомікі найбольш запатрабаваны менавіта кадры рабочых прафесій. Сёлетняя прыёмная кампанія паказала, што ў нас істотна павялічыўся конкурс ва ўстановы прафтэх- і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У гэтым годзе частка выпускнікоў 9-х класаў, якія хацелі паступіць у прафтэх- і сярэднія спецыяльныя ўстановы, нават была вымушана вярнуцца ў школы ў 10-11-я класы — гэта добры момант, але мы хацелі б рухацца далей. У краіне працуюць 52 рэсурсныя цэнтры, дзе ў рамках сеткавага ўзаемадзеяння праходзіць навучанне практычна ўвесь кантынгент навучэнцаў устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі».*

# Вось такой шырыні!



Фота БелТА.

У фермерскай гаспадарцы Гомельскай вобласці збіраюць багаты ўраджай. Спрыяльныя кліматычныя ўмовы дазваляюць вырошчваць тут спрадвечна паўднёвыя ягады і гародніну. Каля 30 сартоў кавуноў, а гарбузы і перцы паспяхова культывуюцца на бахчавых плантацыях у фермерскай гаспадарцы «Бахча Грынько» Ігара ГРЫНЬКО.

**На здымку: гомельскі фермер Ігар ГРЫНЬКО.**

## КОРАТКА

- **Плацежную сістэму UnionPay плануюць актыўна ўкараняць у Беларусі.**
- БрДТУ падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве з інданезійскім універсітэтам.
- **У Глыбоцкім раёне адкрыўся стацыянарны сацыяльны пункт.**
- Камісіі па вырашэнні канфлікту інтарэсаў педработніка створаць ва ўстановах адукацыі.

На асеннім полі

## ВЯЛІКАЯ ПРАЦА — ЭЛІТНАЯ БУЛЬБА

**Віцебскі занальны інстытут сельскай гаспадаркі НАН Беларусі, які знаходзіцца ў аграгарадку Тулава Віцебскага раёна, адным з першых у рэгіёне пачаў уборку бульбы. Сёлета «другі хлеб» дае высокія ўраджайныя вынікі — 320 цэнтнераў з гектара.**



Фота Аляксандры ГВОЗДЗЕВАЙ.

ВЗІСГ з'яўляецца адзінай установай у паўночным рэгіёне, дзе арганізавана хуткаснае мікракланальнае размнажэнне бульбы з высокімі якасцямі смаку на аснове найноўшых дасягненняў біятэхналогіі. Іншымі словамі, яе вырошчваюць у лабараторных умовах, што мінімізуе заражэнне караняплодаў вірусамі, а потым пераносяць у цяпліцы і на палі.

СТАР. 3

Асабістыя звесткі

## АБАРАНЯЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ ПЕРСАНАЛЬНЫЯ ДАНЫЯ ПРАВІЛЬНА

### навучаць асоб, якія адказваюць за іх апрацоўку і распаўсюджванне




**Прадстаўнікі банкаўскай сферы, медыцыны, рытэйлу, страхавання, органаў натарыяту, райвыканкамаў, рыэлтарскай дзейнасці і іншыя асобы (як дзяржаўных, так і прыватных арганізацый) на гэтым тыдні сталі студэнтамі. Іх аб'яднала адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі ў сферы абароны персанальных даных для асоб, якія ў арганізацыях і ведамствах адказваюць за наладжванне працэсу апрацоўкі асабістых даных людзей. На днях праграма афіцыйна стартавала ў Нацыянальным цэнтры абароны персанальных даных (НЦАПД).**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

22175

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «У АСНОВЕ ПАВІННА БЫЦЬ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную пытанням удасканалення заканадаўства аб грамадзянстве і правядзенні амністыі. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэтыя пытанні сёння набылі пэўнае гучанне ў нашым грамадстве.**

Першае з іх — удасканаленне заканадаўства аб грамадзянстве. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, тэме грамадзянства заўсёды ўдзяляецца вялікая ўвага. Тут, паводле яго слоў, маецца дзве прычыны. Першая — клопат аб бяспецы дзяржавы. Другая — добрапрыстойныя і працавітыя грамадзяне — самае галоўнае багацце краіны.

«Мы заўсёды рады вітаць на беларускай зямлі тых, хто шчыра жадае стаць грамадзянінам нашай краіны і зрабіць свой унёсак у яе развіццё», — сказаў Прэзідэнт. Па яго словах, за мінулыя пяць гадоў грамадзянства Рэспублікі Беларусь па розных падставах набылі каля 14 тысяч чалавек. Пры гэтым кожная просьба аб прыёме ў грамадзянства дасканала вывучаецца адпаведнымі службамі. Пытанні, якія па законе патрабуюць прэзідэнцкага вырашэння, разглядаюцца спецыяльнай камісіяй.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што грамадзянамі Беларусі імкнуцца стаць і становяцца выхадцы з розных дзяржаў, найперш, вядома, постсавецкай прасторы. Але таксама да нас едуць ураджэнцы краін Азіі, Еўропы і нават Амерыкі.

«У жніўні мінулага года я даручыў паскорыць наданне грамадзянства ўкраінцам. Гэта нашы людзі. Яны звязалі сваё жыццё з Беларуссю — выконваюць законы, гадуюць дзяцей, добра працуюць: у сельскай гаспадарцы, адукацыі, медыцыне, навуцы. За год беларускія пашпарты выдадзены ўжо каля 5 тысячам украінцаў. Але да пытанняў надання грамадзянства варта падыходзіць узважана і акуратна, абавязкова ўлічваючы нацыянальныя інтарэсы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што пастаянна патрабуе ад адпаведных структур інфармацыю па гэтым пытанні. Прэзідэнт заўважыў, што бачыць пэўную занепакоенасць беларускіх грамадзян наконт таго, што трэба больш акуратна ставіцца да прыёму ў грамадзянства і ўвогуле допуску на тэрыторыю Беларусі некаторых грамадзян Украіны.

«Я хачу гэтым людзям сказаць, што турбавацца на трэба. Мы ўсё разумеем і бачым: хто і чаго прыязджае да нас — каб проста ўкол зрабіць і назад вярнуцца або застацца тут. Некаторыя транзітам едуць праз Беларусь на Захад ці ў Расію. Усе знаходзяцца пад кантролем», — запэўніў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што ў рамках падрыхтаванага законапраекта трэба яшчэ раз паглядзець на тых беларусаў, хто, выехаўшы за мяжу, дзейнічае на шкоду дзяржаве і народу, учыняючы злачынствы. Ён канстатаваў, што такія людзі вядомыя ўсе да адзінага. «Ці вартыя яны заставацца грамадзянамі Беларусі, калі ўцяклі з роднай краіны і фактычна разарвалі з ёй сувязь?» — задаў пытанне Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што дэпутаты і грамадзяне прапаноўвалі пазбаўляць грамадзянства асоб, якія збеглі за мяжу і там працягваюць злачынную дзейнасць.

Таксама кіраўнік дзяржавы адзначыў, што неабходна абмеркаваць патрабаванні да нашых суайчыннікаў, якія атрымалі карту паляка і іншыя падобныя дакументы. «Трэба разабрацца: ці яны грамадзяне Беларусі, ці яны — аблудныя беларусы, якія ўзялі гэтую карту, можа быць выпадкова, або ў іх іншая арыентацыя», — сказаў ён.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, у органаў унутраных спраў і дыпламатычнай службы ёсць і іншыя пытанні ў сферы грамадзянства, якія выклікаюць занепакоенасць.

### «ЁСЦЬ ЛЮДЗІ, ЯКІХ МЫ МОЖАМ ВЫЗВАЛІЦЬ ДАТЭРМІНОВА»

Другое пытанне нарады — амністыя. Апошні раз яна праводзілася ў краіне ў маі 2020 года. «Зараз наша краіна апынулася пад беспрэцэдэнтным ціскам Захаду. Але нават у такіх умовах беларускае грамадства застаецца згуртаваным і кансалідаваным. Таму напярэдадні Дня народнага адзінства 17 верасня прапануецца абмеркаваць мэтазгоднасць амністыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што традыцыйна да вялікіх дат і падзей робіцца гэты сімвалічны для народа крок. Па яго словах, і для тых, каго выпускаюць на свабоду, гэта важны момант у жыцці, хоць яны і па-рознаму адаптуюцца ў грамадстве.

«Сярод асуджаных ёсць самыя розныя людзі. У іх ліку і тыя, хто недзе выпадкова спатыкнуўся, і тыя, якія ўчынілі злачынствы па неасцярожнасці, нязначныя злачынствы, ёсць і людзі, будзем казаць шчыра, пратэснай накіраванасці. За апошнія два гады паразумнелі ўсе, асабліва ў месцах не такіх аддаленых. Калі яны раскаяліся, сталі на шлях выпраўлення і цалкам загладзілі віну, да іх можна праявіць ласку», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў абмеркаваць кола асоб, на якіх трэба распаўсюдзіць амністыю.

«Людзі яшчэ не адышлі ад 2020 года. Часам і перагібы допускаюцца з боку нашых прыхільнікаў: «Усіх мачыць, саджаць». Адзінства ў грамадстве гэта ніколі не дадавала. Але проста пайсці і не чуць гэтых людзей — так не будзе. Я да чаго. Магчыма, канчатковы варыянт законапраекта разгледзець на нейкай камісіі, групе, у тым ліку і з удзелам нармальнай апазіцыі. Запрасіць людзей, якія, магчыма, маюць іншы пункт гледжання на развіццё нашага грамадства. Яны не ворагі, няхай яны выкажуць сваё меркаванне», — прапанаваў беларускі лідар.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што падпісваць указ прыйдзецца яму. «Таму майце на ўвазе: усё, што я сказаў, па духу павінна адпавядаць. Мы не можам прыслухоўвацца да часткі грамадства і налева-направа ўсіх выпускаць. Хто павінен сядзець у турме — павінен сядзець. Але ёсць людзі, якіх мы можам вызваліць датэрмінова», — канстатаваў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што паслабленні дапушчальныя толькі ў стаўленні тых, хто рэальна гэтага заслугоўвае.

«У аснове павінна быць справядлівасць. Бандыты і экстрэмісты не з гэтай серыі! Асабліва тыя, хто спрабаваў пад адхон пусціць нашы цягнікі, рыхтаваў тэрарыстычныя акты і спрабаваў забіць нашых грамадзян», — падкрэсліў ён.

### ПАСЛУЖЫЦЬ ЭФЕКТЫЎНЫМ ІНСТРУМЕНТАМ У ЗАХАВАННІ ЗАКОННАСЦІ

Асноўным дакладчыкам на нарадзе выступіў міністр унутраных спраў Іван Кубракоў. Ён расказаў, якія навуўвядзенні прадугледжвае законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадзянстве». «У праекце маецца змяненне і дапаўненне шэрагу палажэнняў закона ў мэтах забеспячэння ўнутранай бяспекі дзяржавы, грамадска-палітычнай стабільнасці», — падкрэсліў Іван Кубракоў.

У прыватнасці, прадугледжваецца, што асоба, якая знаходзіцца за межамі Беларусі, можа страціць беларускае грамадзянства (у тым ліку атрыманае па нараджэнні) пры наяўнасці прыгавора суда, які ўступіў у законную сілу, які пацвярджае ўдзел такой асобы ў экстрэмісцкай дзейнасці і прычыненні цяжкай шкоды інтарэсам Рэспублікі Беларусь. Прапануецца, што такое рашэнне будзе прымаца кіраўніком дзяржавы па прапанове камісіі па пытаннях грамадзянства.

«У далейшым у дачыненні да экстрэмістаў, які страціў грамадзянства Беларусі, прапануецца прымаць рашэнне аб забароне ўезду ў краіну тэрмінам да 30 гадоў. Таксама можна разлічваць на прафілактычны эфект гэтай заканадаўчай ініцыятывы», — лічыць міністр унутраных спраў. Згодна з законапраектам, грамадзяне будуць абавязаны інфармаваць кампетэнтныя органы аб набыцці грамадзянства замежнай дзяржавы або атрыманні віду на жыхарства ці іншага дакумента, які дае правы на льготы і іншыя перавагі.

Змены, якія ўносяцца ў Закон «Аб грамадзянстве», дазволяць сфармаваць масіў даных, які ў далейшым паслужаць эфектыўным інструментам у забеспячэнні інтарэсаў дзяржавы і захаванні законнасці. У прыватнасці, такая інфармацыя можа быць выкарыстана падчас прыёму на дзяржаўную службу і іншых пытаннях», — падкрэсліў Іван Кубракоў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

У тэму

Андрэй ШВЕД:

### «Дзяржава традыцыйна праяўляе гуманізм да тых, хто здзейсніў злачынства»

Пасля нарады з кіраўніком дзяржавы яе ўдзельнікі падрабязна расказалі журналістам, якая далей будзе праводзіцца работа па пытаннях грамадзянства і амністыі. Генеральны пракурор Андрэй Швед падкрэсліў, што дзяржава традыцыйна праяўляе гуманізм да асоб, якія ўчынілі злачынствы. Толькі ў 2019 і 2020 гадах з прымяненнем акта амністыі больш за 30 тысяч асоб, асуджаных за ўчыненне злачынства, альбо былі вызвалены з месцаў пазбаўлення волі, альбо тэрмін пакарання быў скарочаны на адзін год. Па яго словах, на нарадзе адно з пытанняў — падыходзіць традыцыйна ці ўсё ж улічыць тыя абставіны і падзеі, якія былі ў жніўні 2020 года. «Нягледзячы на дастаткова прынцыповую пазіцыю Генеральнай пракуратуры, што акт амністыі не павінен распаўсюджвацца на тых асоб, якія замахнуліся на суверэнітэт, незалежнасць, канстытуцыйны лад нашай краіны ў 2020 годзе, кіраўнік дзяржавы даручыў узважана падысці да гэтага пытання, індывідуальна і ў першую чаргу праз інстытут памілавання. Гэта значыць, тыя асобы, якія здзейснілі злачынствы, звязаныя з экстрэмізмам; тыя, якія замахнуліся на нашу дзяржаву і паднялі руку на праваахоўнікаў, могуць выйсці на волю. Але найперш толькі тыя, хто раскаяўся, хто ўсвядоміў і лічыць магчымым звярнуцца да нашага Прэзідэнта з просьбай аб памілаванні», — расказаў Андрэй Швед.

Таксама генеральны пракурор адзначыў, што будзе створана камісія «з нармальнай апазіцыяй», пра якую гаварыў Прэзідэнт. Яе дзейнасць будзе адкрытай і зразумелай, паколькі кіраўнік дзяржавы даручыў падыходзіць індывідуальна і акуратна ў гэтым пытанні.

Журналісты запыталіся, колькіх грамадзян можа закрануць амністыя, якую плануюць правесці да Дня народнага адзінства. Андрэй Швед расказаў, што гаворка ідзе прыкладна аб 8 тысячах чалавек і вышэй. «Гэта як класічныя падыходы, якія датычацца вызвалення ад адказнасці інвалідаў, шматдзетных, адзінокіх маці і гэтак далей, так і асоб, якія здзейснілі іншыя злачынствы. Пералік складаў злачынстваў, якія будуць падпадаць пад дзеянне закона аб амністыі, вызначаць у найбліжэйшы час», — растлумачыў ён.

---

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «НЯМА НЕВЫРАШАЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ»

**Прэзідэнт правёў рабочую сустрэчу з першым намеснікам прэм'ер-міністра Мікалаем Снапковым. На парадку дня — актуальныя пытанні.**

Першае з іх — кітайскі напрамак. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэта персанальная адказнасць Мікалая Снапкова. Другое пытанне — імпартазамяшчэнне.

Трэцяе пытанне — праходжанне фінансаў за пастаўленую прадукцыю: эканамічны і фінансавы блок. Прэзідэнт пацікавіўся, як Нацыянальны банк дапамагае прадпрыемствам. «Ды і ўрад дапамагае нашым прадпрыемствам у беспарашкодным праходжанні аплаты фінансавых рэсурсаў за пастаўленую прадукцыю. Прыклад таму — БелОМА, дзе мне нейкую казку на тры старонкі напісаў. Мне не трэба лісты, мне трэба вырашэнне пытання. Звярнуліся людзі па дапамогу — трэба дапамагчы. Няма невырашальных праблем. Не хачу прыводзіць прыклады, каб на ўвесь свет чулі. Людзі умеюць прадаваць прадукцыю і грошы за гэта атрымліваць. А нехта не ўмее. А калі нехта не хоча ў гэтай сітуацыі працаваць, вы таксама павінны ўнесці адпаведныя прапановы па іх», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

І пятая пазіцыя — асобныя прадпрыемствы, іх стан спраў і перспектывы. «Па дакладах быццам бы ў кагосьці горш, у кагосьці лепш, але праблемы вырашаюцца», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

---

У тэму

Мікалай СНАПКОЎ:

### «Экспарт прырастае»

Першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў расказаў журналістам, аб чым ішла размова на сустрэчы з Прэзідэнтам. Ён распавёў, што беларускія банкі падключацца да кітайскага аналага SWIFT — нацыянальнай сістэмы банкаўскіх пераводаў CIPS. У Беларусі таксама будуць актыўна ўкараняць міжнародную плацежную сістэму UnionPay. Яна была заснавана яшчэ ў 2002 годзе, ініцыятарамі яе стварэння выступілі Дзяржсавет і Народны банк Кітая. Як плануецца, у снежні Беларусбанк пачне ўжо выпускаць плацежныя карты гэтай сістэмы. «Гэта значыць, карткі, якімі беларусы змогуць разлічвацца ўнутры краіны, у Кітаі і яшчэ ў больш як сотні краін свету», — сказаў Мікалай Снапкоў.

Што да эканомікі, то, па словах віцэ-прэм'ера, у санкцыйны 2022 год беларускі экспарт паказвае рэкордныя аб'ёмы. «У імпартазамяшчэнні самае галоўнае — экспарт. Таму з задавальненнем магу канстатаваць, што чацвёрты месяц запар, экспарт прырастае. Сальда традыцыйна ў апошнія месяцы складваецца гістарычна высокае. Больш за тое, аналітыка паказвае, што за перыяд з 2015 года сярэднямесячны экспарт тавараў у Беларусі складаў $2,5 млрд, за ліпень — $3,2 млрд. Гэта значыць, у санкцыйны 2022 год экспарт, адрэзаны ад Еўрапейскага саюза і ад Украіны, паказвае гістарычна рэкордныя аб'ёмы ў абсалютным выражэнні», — адзначыў ён.

Першы віцэ-прэм'ер таксама нагадаў аб праграме супрацоўніцтва з Расіяй па фінансаванні імпартазамяшчальных праектаў у Беларусі. Паводле яго слоў, падрыхтоўка пагаднення знаходзіцца на завяршальнай стадыі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Слова маладых

# БРСМ: НОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ І ПЕРАМОГІ

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі адзначае гэтымі днямі 20-годдзе з дня стварэння арганізацыі. Маладзёжны саюз сабраў сваіх сяброў з розных куткоў краіны ў Мінскім гарадскім палацы культуры на святочны хранограф «БРСМ: Учора. Сёння. Заўтра», прысвечаны юбілею арганізацыі.**



Перад пачаткам хранографа на адкрытай пляцоўцы і ў фае Палаца культуры разгарнулася маштабная інтэрактыўная выстава дасягненняў абласных арганізацый БРСМ за два дзесяцігоддзі. Можна ўбачыць узнагароды, атрыбутыку, кадры хронікі, пазнаёміцца з дзейнасцю студэнцкіх і маладзёжных атрадаў ахövы правапарадку. Тут жа прапануецца даведацца пра гісторыю развіцця маладзёжнага руху, пагутарыць з пераможцамі праектаў БРСМ «100 ідэй для Беларусі», «Валанцёр года», «Уладар вёскі», «Фермер-пачатковец».

Удзельнікаў мерапрыемства вітаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА**. «Гэтымі днямі Беларускаму рэспубліканскаму саюзу моладзі спаўняецца 20 гадоў. Гэта зусім невялікі, можна нават сказаць, юны ўзрост. Сёння БРСМ — жывы арганізм. Гэта 350 тысяч самых лепшых маладых людзей з розных куткоў нашай краіны, самых патрыятычных, адданых сваёй краіне, якія жывуць ідэямі гуманізму, высакароднасці, якія займаюць высокую грамадзянскую пазіцыю і праяўляюць сапраўдны патрыятызм у паўсядзённай дзейнасці», — сказаў Ігар Сергеенка.

Па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзыдэнта, Аляксандр Лукашэнка правільна вызначыў будучыню БРСМ як адзінай вядучай маладзёжнай арганізацыі. «Сустракаючыся ў маі гэтага года з актывам піянерскай арганізацыі і кіруючым складам БРСМ, Аляксандр Лукашэнка даў арыенціры на далейшае развіццё БРСМ, на больш шчыльнае ўзаемадзеянне гэтых дзвюх структур. Таму што сёння піянеры — заўтра члены Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. І БРСМ павінен станавіцца (і ў гэтым напрамку работа ідзе) сапраўды вядучай сілай і апорай, цэнтрам усёй маладзёжнай палітыкі нашай краіны», — адзначыў Ігар Сергеенка. Ён павіншаваў удзельнікаў мерапрыемства з юбілеем БРСМ і пажадаў моладзі новых творчых поспехаў, новых ініцыятыў, новых праектаў, увасаблення іх у жыццё.

«Самае галоўнае, дапамога з боку дзяржавы вам будзе ў гэтых пытаннях забяспечана. Прыцягваць у свае шэрагі таленавітую, здольную, актыўную, патрыятычную моладзь, каб у вашых радах станавілася больш сапраўдных маладзёжных лідараў, каб актыў быў сапраўдны, нефармальны, на які можна было б заўсёды абаперціся ў любых пытаннях», — сказаў ён.

Ігар Сергеенка таксама агучыў прывітальны адрас кіраўніка дзяржавы.

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА**, які таксама прыняў удзел у святочным хранографе, адзначыў, што сёння для моладзі ў краіне створана камфортнае асяроддзе для дзейнасці. І новыя ініцыятывы, і падыходы моладзі даюць свой вынік.

«Мы спадзяёмся, што як у колькасных, так і, што асабліва важна, у якасных параметрах Саюз моладзі будзе развівацца, мацнець. І мы, старэйшае пакаленне, будзем прыкладаць усе намаганні для таго, каб дапамагаць, залішне не апекаваць, але менавіта падтрымліваць усе вашы добрыя пачынанні. Гэта таксама кіраўнік дзяржавы падкрэсліваў на адкрытым уроку 1 верасня. Калі ласка, уносьце свае прапановы, ініцыятывы, мы гатовы іх падтрымліваць і рэалізоўваць разам з вамі, каб была сапраўды сумесная праца, сумесныя праекты», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

«Паколькі менавіта ад вас залежыць будучыня нашай краіны, думаю, што чарговыя 20 гадоў БРСМ азнамянуюцца новымі дасягненнямі і перамогамі. Хочацца пажадаць цяперашняму пакаленню закласці надзейны падмурак Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і перадаваць яго новым пакаленням для таго, каб мы сапраўды развівалі, умацоўвалі і ганарыліся нашай краінай, роднай Беларуссю», — дадаў Ігар Петрышэнка.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ВЯЛІКАЯ ПРАЦА — ЭЛІТНАЯ БУЛЬБА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах **дырэктара інстытута Андрэя БАЛЫША**, установа вядзе падтрымлівальную селекцыю, і адначасова вучоныя шукаюць новыя гатункі, якія падыходзяць пад кліматычныя ўмовы вобласці і спрыяюць павышэнню ўраджайнасці ў гаспадарках на 20—25 працэнтаў.

На інстытуцкае поле ў першыя вераснёўскія дні выпраўляемся разам з галоўным аграномам Іванам Чэкалавым і загадчыцай аддзела бульбаводства Святланай Ціханенкай. Сёлета пад «другі хлеб» у прадпрыемстве адведзена 75 гектараў, за два тыдні тулаўскія аграрыі ўбралі амаль чвэрць плошчаў. Старт уборцы далі гатункі ранняй групы спеласці «Уладар», «Брыз», «Лілея», а цяпер увага аддаецца ружавабокім клубням «Маніфеста». Усяго ў гэтым сезоне высаджана восем гатункаў ранняй, сярэднеранняй, сярэдняспелай і сярэдняпозняй груп спеласці. Захаванне тэхналогій на кожным этапе палявых работ — прыярытэтны напрамак дзейнасці навуковай арганізацыі, якая нясе адказнасць за якасны пасадачны матэрыял не толькі для віцебскіх гаспадарак, але і для ўсёй краіны.

Інстытут сельскай гаспадаркі ў сваёй дзейнасці робіць акцэнт не на вялікім танажы, а на атрыманні якаснай насеннаводчай фракцыі. У лабараторыі мікраклanальнага размнажэння вучоныя вырошчваюць бульбу ў прабірках у стэрыльных умовах. Пасля расліны беражліва пераносяцца ў цяпліцы, праз пэўны прамежак часу фарміруюцца мікраклубні, іх на наступны год высаджваюць у пітомнік першага клубневага пакалення, плошча якога займае каля гектара. А пасля ўжо паўнавартасныя каранаплоды пераносяцца ў пітомнік вытворчага размнажэння (9 гектараў), з яго на трэці год атрымліваюць гатунку ўзроўню супер, суперэліты — самая чыстая лінейка, якая ідзе ў продаж. Усе эксперыментальныя маніпуляцыі праводзяць уручную — у штаце ўстановы шчыруюць 70 спецыялістаў, зараз пад пільнай увагай у пітомніку знаходзіцца гатунак «Мастак». На чацвёрты — апошні сезон — гатунак пераходзіць у катэгорыю суперэліты, і інстытут больш не паніжае рэпрадукцыю. Ва ўласнай гаспадарцы такая бульба дае багаты ўраджай ад чатырох да шасці гадоў, пасля яе трэба аднаўляць.

Цікавы факт: для вывядзення «чыстых» гатункаў не рэкамендуецца ўносіць натуральныя ўгнаенні, бо яны правакуюць развіццё вірусных інфекцый. Каб, як кажуць у народзе, «узімку палонпаць», падчас палявых работ неабходна добра пратруціць клубні перад пасадкай, правесці дзве фунгіцыдныя апрацоўкі і прафілактыку ад каларацкага жука.

На ўборцы ў прадпрыемстве задзейнічаны чатыры машыны і два бульбакапальныя камбайны, на адным з якіх працуе малады механізатар Яўген Казлоў. З 21 года жыццё пяць гардскі хлопец звязаў з сельскай гаспадаркай. Любоў да працы з тэхнікай яму прывіў бацька Віктар Генадзьевіч, які ўжо восем гадоў за рулём барозніць інстытуцкія палі.

«Тэхніка з дзяцінства выклікала ў мяне непадробны інтарэс: яшчэ хлапчуком я заўсёды быў у трактары разам з бацькам — а яго працоўны сельскагаспадарчы летапіс вылічаецца амаль 30 гадамі. Гэтае захапленне велічэу агрэгатаў і маляўнічымі краявідамі прастораў вызначылі мой прафесійны шлях», — расказвае Яўген.

З 16 гадоў ён з бацькам у складзе сямейнага экіпажа працаваў памочнікам камбайнера. У Гарадоцкім дзяржаўным аграрна-тэхнічным каледжы атрымаў спецыяльнасць тэхніка-механіка, на вытворчай практыцы адточваў атрыманыя веды. Пасля арміі вярнуўся ў Віцебскі занальны інстытут сельскай гаспадаркі і з мая цвёрда стаіць у адным страі з Віктарам Генадзьевічам і іншымі вопытнымі аграрыямі. А яны ў сваю чаргу дапамагаюць маладому спецыялісту ў складаных палявых момантах, падстаўляючы надзейнае плячо. «Адказны і не па гадах прафесійны механізатар», — так ва ўстанове характарызуюць Яўгена, таму і даверылі юнаку адзін з двух бульбакапальных камбайнаў.

Мала таго, што ён у такім маладым узросце апантана закаханы ў сельскую гаспадарку, — аб чым прызнаецца шчыра і з натхненнем, — у Жэні хапае часу на рэдкае для хлопцаў хобі — вакал. Вясёлы і шчаслівы, ён крочыць па нялёгкай сельскагаспадарчай сцяжынцы, з якой збочваць не збіраецца: кіраўніцтва прадпрыемства стварыла добрыя ўмовы працы, калектыў дружалюбны і знаёмы, а, галоўнае, прафесія прыносіць сапраўднае задавальненне. Тут, у інстытуце, ён працуе яшчэ і разам з сябрам-аднагрупнікам Мікітам — разам, з характэрным для маладосці запалам, яны ўстанаўліваюць свае асабістыя сельскія рэкорды на ўрадлівых прыдзвінскіх палях.

У гэтым сезоне ўборку «другога хлеба» плануюць завяршыць да першага кастрычніка. Насенне інстытуцкай бульбы ахвотна набываюць гаспадаркі Віцебшчыны, Гомельшчыны і Міншчыны, а вясной фірмовы магазін «Аграрны», які ў мінулым годзе адкрыўся пасля рамонту, карыстаецца папулярнасцю ў насельніцтва. Акрамя якаснага пасадачнага матэрыялу, магазін рэалізуе садавіну і агародніну, насенне і фуражнае збожжа — прадпрыемства актыўна займаецца вытворчасцю збожжавых, зернебабовых, крыжакветных культур.

Гарачы ўборачны сезон для тулаўскіх аграрыяў не скончыўся: актыўна ўбіраюць яравы рапс і пачынаюць сяўбу азімага ячменю.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Крамлі анансавалі паездку Пуціна ў Данбас

Прэс-сакратар расійскага прэзідэнта Дзмітрый Пяскоў расказаў, што, калі прыйдзе час, Уладзімір Пуцін наведае Данбас. Пра гэта паведамляе газета «Известия».

«Я не сумняваюся, што, калі час прыйдзе, такая паездка адбудзецца», — адзначыў прадстаўнік Крамля, адказваючы на пытанне журналіста выдання.

Пяскоў таксама акцэнтаваў увагу на тым, што РФ будзе і надалей садзейнічаць аднаўленню і развіццю Данбаса.

Таксама Пяскоў заявіў, што для сустрэчы лідараў Расіі і Украіны Уладзіміра Пуціна і Уладзіміра Зяленскага неабходна пабудаваць падмурак дамоўленасцяў, якія будуць замацаваны, але пра гэта, паводле яго слоў, пакуль размова не ідзе.

«Сустрэча дзеля сустрэчы нікому не патрэбна. Для таго, каб такая сустрэча магла адбыцца і каб сама яе ідэя была на парадку дня, трэба зрабіць працу і пабудаваць падмурак тых дамоўленасцяў, якія можна будзе зафіксаваць на вышэйшым узроўні. Пра гэта пакуль гаворкі не ідзе», — сказаў ён.

### Джонсан падзякаваў свайму сабаку Дзіліну, пакідаючы Даўнінг-стрыт

Барыс Джонсан, які пайшоў у адстаўку з пасады прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі, пакідаючы рэзідэнцыю на Даўнінг-стрыт разам з жонкай Кэры Джонсан, сярод іншага падзякаваў і свайму сабаку Дзіліну за клопат. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны».

«Дзякуй усім, хто ў гэтым будынку са мной. Дзякуй усім ва ўрадзе. Дзякуй усім, хто дапамагаў клапаціцца пра мяне і маю сям'ю ў апошнія тры гады, уключаючы Дзіліна, сабаку», — сказаў ён.

Адзначаецца, што Джонсан не згадаў ката Лары, які таксама жыў у рэзідэнцыі. Пры гэтым у «Твітэры» Лары раней некалькі разоў з'яўляліся пасты з крытыкай і высмейваннем Джонсана. У агенцтве згадалі, што кот быў узяты з прытулку і жыве ў рэзідэнцыі прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі з 2011 года. З ім разам жылі тры прэм'еры — Дэвід Кэмеран, Тэрэза Мэй і Борыс Джонсан.

5 верасня кіраўнік брытанскага МЗС Ліз Трас была аб'яўлена пераможцам у барацьбе за пасаду лідара Кансерватыўнай партыі і прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі. У фінальным туры выбараў яна спаборнічала з былым міністрам фінансаў Рышы Сунакам.

### У бундэстагу заклікалі немцаў выходзіць на пратэсты супраць антырасійскіх санкцый



Немцы павінны выйсці на масавыя пратэсты супраць антырасійскіх санкцый, а таксама правальнай энергетычнай і сацыяльнай палітыкі ўрада Германіі. З такім заклікам выступіла дэпутат бундэстага ад Левай партыі ФРГ Севім Дагдэлен у сваім артыкуле для часопіса Junge Welt.

«Федэральны ўрад завёў сябе ў тупік эканамічнай вайной супраць Расіі. СДПГ, «Зялёныя» і СвДП сацыяльна разбураюць большую частку насельніцтва, знішчаючы мільёны працоўных месцаў», — напісала палітык.

«Нельга даць сябе абдурыць і запалохаць. Неабходны шырокі пратэст — супраць надбаўкі да цаны на газ, за абмежаванне цэн на энергію, а таксама за падатак на звышпрыбыткі бенефіцыяраў крызісу — энергетычных канцэрнаў, фармацэўтычных гігантаў і прадпрыемстваў ваеннай прамысловасці. Такія нашы мінімальныя патрабаванні на гэтую спякотную восень. І далоў эканамічныя санкцыі, якія нас разбураюць!» — звярнулася яна да нацыі.

# АБАРАНЯЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ ПЕРСАНАЛЬНЫЯ ДАНЫЯ ПРАВІЛЬНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### УНУТРАНЫ КАНТРОЛЬ

Махляры, як паказвае практыка, цяпер найчасцей укладваюцца не ва ўзлом абароненых інфармацыйных сістэм, а ў работу з іх супрацоўнікамі, намагаючыся атрымаць праз людзей патрэбныя звесткі. Менавіта таму важна навучыць тых, хто працуе з персанальнымі данымі, рабіць гэта правільна, каб яны данеслі нарматыўныя правілы да астатніх работнікаў арганізацый, а таксама папярэдзілі пра адказнасць за незаконнае распаўсюджванне звестак (да пяці гадоў пазбаўлення волі), акрэсліў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных Андрэй ГАЕЎ**. Ён заўважыў, што афіцыйны старт адукацыйнай праграмы на пачатку верасня працягнуў дні трыумфу адукацыі ў Беларусі і стаў з'явай рэспубліканскага значэння:

**«Што прадпрымаць, каб абараніць ПД, арганізацыі вызначаюць самастойна, бо ў кожнай асабістыя маштабы бізнесу і спецыфіка справы. Аднак, вядома, ёсць шэраг абавязковых для выканання патрабаванняў».**

— Змененая Канстытуцыя сёлета дапоўнілася палажэннем, згодна з якім дзяржава гарантуе стварэнне ўмоў для абароны персанальных даных (ПД), бяспекі асобы і грамадства пры іх выкарыстанні. А прынятым летась у лістападзе **Законам аб абароне персанальных даных** прадугледжаны шэраг мер, каб гэтыя ўмовы рэалізоўваліся. І адна з найважнейшых умоў — назначэнне ў кожнай арганізацыі чалавека, які б адказваў за ўнутраны кантроль за апрацоўкай персанальных даных. Хоць персанальныя даныя, як і раней, належаць толькі нам самім, яны набылі эканамічную каштоўнасць. Таму спецыялістам, якія займаюцца іх апрацоўкай, трэба мець неабходны ўзровень ведаў, каб папярэдзіць парушэнні, звязаныя з абаротам і незаконным распаўсюджваннем звестак пра кожнага з нас.





У Цэнтры створана цудоўная матэрыяльна-тэхнічная база (інтэрактыўныя адукацыйныя тэхналогіі, практыка-арыентаваныя праграмы) і працуюць найлепшыя выкладчыкі, запэўніў **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ**, уручаючы дырэктару НЦАПД сертыфікат дзяржаўнай акрэдытацыі, які сведчыць, што ўстанова цяпер можа ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць:

— Слухачы могуць быць упэўненымі ў тым, што ў НЦАПД умовы, педагагічны склад і праграма курса ў многім могуць быць узорам для іншых устаноў адукацыі краіны. Мінадукацыі сёння, пэўна, — адзін з найбуйнейшых сярод дзяржорганаў утрымальнік персанальных даных, таму было б добра, каб кіраўнікі органаў адукацыі ўсіх узроўняў (ВНУ, школ, дзіцячых садкоў) прайшлі тут навучанне. Нам патрэбны якасныя, кваліфікаваныя і дасведчаныя ў веданні закона па апрацоўцы даных работнікі.

### РЫЗЫКА-АРЫЕНТАВАНЫ ПАДЫХОД

Выкладчыкі — гэта работнікі Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных, навуковыя супрацоўнікі ВНУ і іншых арганізацый. А прайсці навучанне змогуць не толькі асобы, якія займаюцца апрацоўкай ПД у арганізацыях, але і звычайныя людзі, якія хочуць разабрацца ў заканадаўчых момантах выкарыстання таго ж пашпарта ці неабходнасці падпісваць пэўныя згоды на распаўсюджванне звестак пра сябе. Пасля завяршэння курса ўсе студэнты атрымаюць сертыфікат, запэўніў Андрэй Гаеў і ўдакладніў, што адукацыйная праграма была распрацавана спецыяльна пад асаблівасці, звязаныя з работай з ПД у Беларусі:

— Заканадаўства па абароне ПД нетыповае адносна іншых галін права, паколькі ім устаноўлены рызыка-арыентаваны падыход. Згодна з ім, няма дакладных межаў, што трэба выканаць пэўнае правіла па пунктах. Што прадпрымаць, каб абараніць ПД, арганізацыі вызначаюць самастойна, бо ў кожнай асабістыя маштабы бізнесу і спецыфіка справы. Аднак, вядома, ёсць шэраг абавязковых для выканання патрабаванняў.

Асобны блок тэматыкі заняткаў прысвечаны, напрыклад, тэхнічнай крыптаграфічнай абароне інфармацыі, каб у арганізацыі была забяспечана правільная работа інфармацыйных рэсурсаў і сістэм і створаны адпаведныя ўзроўні доступу работнікаў.

— Каб рыхтаваць спецыялістаў больш сістэмна і на больш доўгатэрміновай аснове, праводзіцца шэраг мерапрыемстваў з Беларускім дзяржаўным універсітэтам інфарматыкі і радыёэлектронікі. Так, з новага года плануецца распачаць перападрыхтоўку спецыялістаў, да базавай вышэйшай адукацыі якіх дадаваць IT-складнік, — удакладніў дырэктар НЦАПД. — Гэта ўнікальныя спецыялісты, якія павінны валодаць ведамі і ў галіне права, і ў IT-сферы, і ў іншых галінах.

Выпадкі ўцечкі ПД, якія здараюцца, паказваюць, што найчасцей гэта адбываецца ў замежным сегменце, на іншых даменных зонах. Вельмі важна не дапусціць самога факта ўцечкі, бо «злавіць» у сеціве першасна ўзламаную базу практычна немагчыма. Яна пачынае капіравацца, і нават далейшае выдаленне інфармацыі не здымае магчымасці, што нехта ёй скарыстаецца з пэўнай мэтай, падкрэсліў Андрэй Гаеў:

**— Нельга, напрыклад, вывешваць спісы неплацельшчыкаў жыллёва-камунальных паслуг для агульнага азнаямлення — гэта не тая мера ўздзеяння на чалавека.** Не надта добра і калі страхавыя кампаніі перадаюць звесткі пра захворванне работніка не толькі яго наймальнікам. Аднак нельга і абрастаць паперамі, каб не браць згоду чалавека на апрацоўку яго даных літаральна з любой нагоды: ці то залічэнне дзіцяці ў школу, ці адпраўка работніка ў камандзіроўку.

У цэнтры будуць працягваць і распрацоўку комплексных галіновых рэкамендацый па абароне персанальных даных для розных сфер дзейнасці. Нядаўна іх атрымала сфера адукацыі, амаль завершаны рэкамендацыі для жыллёва-камунальнай гаспадаркі, плануюцца адпаведныя метадалагічныя выклады для сферы медыцыны.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Ваша права

# АГУЛЬНАЕ ЛІЧБАВАЕ ПРЫЗНАННЕ

## чакае натарыяльныя юрысдыкцыі краін СНД

**Гарманізацыя натарыяльных заканадаўстваў краін СНД, праз'рыстасць лічбавых інструментаў на тэрыторыях краін-удзельніц, асучасніванне канвенцый прававой дапамогі і павышэнне якасці натарыяльнага абслугоўвання грамадзян краін СНД і кваліфікацыі натарыусаў — такія напрамкі дзейнасці і задачы былі прынятыя і агучаныя падчас першага пасяджэння Базавай арганізацыі дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў у сферы натарыяльнай дзейнасці. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі натарыятаў і міністэрстваў юстыцыі Беларусі, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана і выканкама СНД.**



Хоць базавае заканадаўства ў частцы грамадзянскіх праваадносін мае агульныя карані, аднак апошнія 30 гадоў натарыяты краін Садружнасці працуюць, кіруючыся сваімі нацыянальнымі заканадаўствамі, заўважыла **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты (БНП)**:

— Здараецца, мы сутыкаемся з сітуацыямі, калі ўзнікаюць калізіі правапрымянення. Напрыклад, натарыус адной краіны, выкарыстоўваючы сваё нацыянальнае заканадаўства, падрыхтоўвае дакументы такім чынам, што часам гэта выклікае пытанні ў краіне прымянення дакумента. А прынятыя на пасяджэнні рашэнні дазволяць выявіць праблематыку, сістэматызаваць яе і знайсці шляхі вырашэння, у тым ліку праз унясенне прапаноў па гарманізацыі заканадаўстваў. Каб нашы грамадзяне і прадстаўнікі бізнесу не адчувалі цяжкасцяў, знаходзячыся на тэрыторыі іншых дзяржаў.

Грамадскія праваадносіны паступова пераходзяць у лічбавую плоскасць, і гэтага не пазбегнуць нават такому класічнаму прававому інстытуту, як натарыят. Нацыянальныя заканадаўствы пераходзяць на «лічбу», аднак у міжнацыянальных зносінах гэтая «лічба» яшчэ нябачная, дадала старшыня БНП:

— Калі электронны дакумент, падпісаны электронным лічбавым подпісам, напрыклад, у Арменіі, то ў Беларусі гэты подпіс нябачны, і натарыусы не могуць пацвердзіць цэласнасць і сапраўднасць дакумента. Як вынік, у чалавека, які прыносіць такі электронны дакумент, адразу ўзнікае праблема, як ацаніць яго якасць. Таму **асобным напрамкам дзейнасці Базавай арганізацыі будзе спроба зрабіць лічбавыя інструменты, прынятыя ў нацыянальных юрысдыкцыях краін СНД, яснымі, празрыстымі і бачнымі як мінімум для натарыятаў краін, а як максімум — для ўсіх грамадзянскіх праваадносін у іх**.

Яшчэ адна важная тэма, якую абмяркоўвалі натарыусы, — канвенцыі прававой дапамогі (Мінская і Кішынёўская), якія прымаліся амаль 30 гадоў таму. Механізмы па спрашчэнні працэдур прававой дапамогі людзям па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах, закладзеныя ў іх, за гэты час устарэлі. Іх трэба асучасніць, зрабіць больш эфектыўнымі і лічбавымі, каб міжнародныя нормы «бачылі» інфарматызацыю працэсаў, якая адбываецца ў грамадзянскіх праваадносінах. Ну і вядома, павышэнне якасці натарыяльнага абслугоўвання грамадзян краін СНД і кваліфікацыі натарыусаў, падсумавалі ўдзельнікі пасяджэння.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Грошы

# Нацбанк выпускае ў абарачэнне памятныя манеты да стагоддзя найбуйнейшага банка краіны



**Згодна з паведамленнем Нацыянальнага банка Беларусі, з 5 верасня 2022 года рэгулятар выпускае ў абарачэнне памятныя манеты «Беларусбанк. 100 гадоў».**

Самая дарагая манета гэтай серыі выканана ў золаце — наміналам 50 рублёў, масай 7,78 грама, дыяметрам 25,00 міліметраў, пробай сплаву 999, тыражом 249 штук. У срэбры манета ацэнена наміналам 20 рублёў, масай 33,63 грама, дыяметрам 38,61 міліметра, пробай сплаву 925 і тыражом 1599 штук. Звычайная, медна-нікелевая, манета гэтай серыі — наміналам 1 рубель, масай 15,00 грамаў, дыяметрам 33,00 міліметраў — мае тыраж 3399 штук.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Скажыце, доктар...

# Лякарствы ад восені

## Як не захандрыць з надыходам халадоў?

**Калі на вуліцы цёмна, холадна і мокра, маркоціцца пачынаюць нават закаранелыя аптымісты. Дажджлівай восенню так і хочацца захутацца ў коўдру і праспаць да самай вясны. Са змяншэннем светлавога дня многія скардзяцца на смутак, аднак, калі такі стан доўжыцца месяцамі, магчыма, гаворка ідзе не проста аб дрэнным настроі, а аб сапраўднай дэпрэсіі.**

**Дэпрэсія з'яўляецца адным з найболей распаўсюджаных псіхічных захворванняў. Ва ўсім свеце на яе пакутуюць каля 5 % насельніцтва. Узрост пачатку захворвання — у сярэднім 30—40 гадоў. Прычым жанчыны хварэюць у два разы часцей за мужчын. Як праяўляе сябе гэта захворванне, як яго своечасова заўважыць і ці можна яго пазбавіцца, расказала ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога цэнтра псіхіятрыіі і псіхатэрапіі Ала ЯКІМЕНКА.**

### Дэпрэсія не залежыць ад матэрыяльнага становішча

***— Ала Уладзіславаўна, якія праявы дэпрэсіі? Ці можна самому правільна вызначыць такі стан?***

— Асноўнай праявай дэпрэсіі з'яўляецца пастаянны паніжаны настрой. Чалавек звычайна кажа, што адчувае нуду, прыгнечанасць, бязрадаснасць, апатыю. Прычым зніжаны настрой узнікае і як адказ на знешнія абставіны (сваркі, канфлікты, хваробы членаў сям'і, буйныя грашовыя страты), так і без знешняй прычыны. Асаблівасць дэпрэсіі ў тым, што непрыемныя падзеі даўно мінулі ці завяршыліся добра, а паніжаны настрой застаецца. Пачуццё гэта ірацыянальнае і не залежыць ад сацыяльнага і матэрыяльнага становішча чалавека. У свой час на дэпрэсію пакутавалі Джэк Лондан, Аляксандр Пушкін, Леў Талстой, Уінстан Чэрчыль...

Другой асноўнай праявай дэпрэсіі з'яўляецца страта ранейшых інтарэсаў і здольнасці атрымліваць задавальненне. Чалавек адчувае сябе як «выціснуты лімон». Абыякава ставіцца да працы, грошай, ежы, сексу, падарожжаў, нават да самых блізкіх.

Трэцяй асноўнай праявай дэпрэсіі з'яўляюцца павышаная стамляльнасць і рухальная затармажанасць. Чалавеку цяжка выконваць штодзённыя абавязкі, напрыклад хадзіць у краму, гатаваць ежу, прыбіраць у кватэры. Пацыенты часта кажуць, што яны «робяць усё праз сілу». Пагаршаецца прафесійная дзейнасць чалавека, самаадчуванне, губляецца ўпэўненасць у сабе. Чалавеку цяжка прымаць рашэнні, засяродзіцца на працы, ён адчувае сябе нікчэмным.

***— Па знешнасці чалавека можна вызначыць, што ў яго дэпрэсія?***

— Характэрны выгляд чалавека ў дэпрэсіі — бледны твар, патухлы погляд, апушчаныя плечы, абыякавасць да сваёй знешнасці, адсутнасць касметыкі і ўпрыгожванняў у жанчын, у адзенні пераважаюць змрочныя тоны. Голас у такіх людзей ціхі і манатонны. Думкі пераважна негатыўнага зместу: «Усё дрэнна», «Нічога нельга змяніць да лепшага», «Выхаду няма», «Я адчуваю тупік». Пры дэпрэсіі знікае палавая цяга, змяншаецца ці цалкам адсутнічае апетыт, зніжаецца маса цела, парушаецца сон — чалавек засынае, а потым прачынаецца ў 3-4 гадзіны ночы і больш не можа спаць.

Магчымыя і непрыемныя адчуванні з боку ўнутраных органаў: галаўныя болі, ціск у вобласці сэрца, «камень на сэрцы», болі ў целе, «усё цела баліць як ад збіцця». Пацыенты з дэпрэсіяй горш адчуваюць сябе ў ранішнія гадзіны, а ў другой палове дня стан крыху паляпшаецца. Пры дэпрэсіі 60—70 % хворых думаюць аб самагубстве (суіцыдзе), а 10—15 % іх здзяйсняюць.

### Дайце чалавеку выгаварыцца

***— Блізкія могуць гэта прадухіліць?***



— Звычайна перадумовай любога суіцыду з'яўляецца нейкая праблема, якую чалавек не можа вырашыць іншым шляхам. Але часцей гэта шэраг прычын, якія сышліся ў адным пункце. Такімі прычынамі могуць быць псіхічныя расстройствы (дэпрэсія, алкагалізм, шызафрэнія, наркаманія), сацыяльныя складнікі (смерць блізкіх, страта працы ці вялікіх матэрыяльных каштоўнасцяў, ізаляцыя), саматычныя захворванні — анкалагічныя, неўралагічныя паталогіі, якія прагрэсіруюць, пажылы ўзрост.

> **«Асаблівасць дэпрэсіі ў тым, што непрыемныя падзеі даўно мінулі ці завяршыліся добра, а паніжаны настрой застаецца».**

Думка аб суіцыдзе, як правіла, фарміруецца працяглы час, таму ёсць магчымасць прадухіліць яго. Неабходна найперш выклікаць гэтага чалавека на шчырасць. Не варта пры гэтым адчуваць збянтэжанасць і няёмкасць. Дайце магчымасць чалавеку выгаварыцца. Варта абмеркаваць з ім яго праблемы і шляхі выхаду з крызісу, прапанаваць сваю дапамогу. Не пакідайце яго ў адзіноце, пабудзьце з ім. Папрасіце пабыць з ім іншых членаў сям'і. Не патрабуйце «ніколі гэтага не рабіць». Прыбярыце з дому патэнцыйна небяспечныя прадметы (вялікую колькасць лекаў, бытавыя яды, тэхнічныя вадкасці, халодную і агнястрэльную зброю). Адмоўцеся на гэты перыяд ад далёкіх паездак, камандзіровак. Заўсёды будзе лепш, калі вы разам з гэтым чалавекам звернецеся да псіхатэрапеўта ці псіхіятра. Чалавек, які вырашыў здзейсніць суіцыд, мае патрэбу ў дапамозе спецыяліста.

***— Куды варта звяртацца?***

— У псіхатэрапеўтычны кабінет паліклінікі па месцы жыхарства. У Мінску ёсць магчымасць звярнуцца ў Гарадскі цэнтр пагранічных станаў і псіхатэрапіі (вул. Мендзялеева, 4). Акрамя гэтага, ёсць служба экстраннай псіхалагічнай дапамогі, куды можна звярнуцца па тэлефоне даверу.

***— Чаго не трэба рабіць блізкім, каб не нашкодзіць?***

— З чалавекам, які вырашыў здзейсніць суіцыд, нельга жартаваць, расказваць анекдоты з «чорнага» гумару і ставіцца да суіцыду як да чагосьці «несур'ёзнага», «дурнога», «праявы слабога характару». Непажадана размаўляць з такім чалавекам камандным тонам: «Не варта так казаць!», «Не варта гэтага рабіць!» Старайцеся не даваць маральныя ацэнкі: «Як табе не сорамна казаць такія рэчы?», «Вазьмі сябе ў рукі!», «А пра сям'ю ты падумаў?»

Нельга лічыць, што чалавек «валяе дурня», «спрабуе маніпуляваць навакольнымі». Нельга спрабаваць ашаламіць чалавека, які здзейсніў суіцыдальную спробу: «Чаму ты не давёў гэта да канца?», «Можа, табе дапамагчы зрабіць гэта?» Трэба ўсведамляць, што дэпрэсія — гэта захворванне, якое неабходна лячыць. Лячэння не варта баяцца, яно можа быць амбулаторным і стацыянарным, падчас якога выкарыстоўваюцца антыдэпрэсанты. Урач прызначыць неабходны прэпарат, падбярэ дозу.

### Кантактаванне абараняе ад дэпрэсіі

***— Што рабіць для прафілактыкі дэпрэсій?***

— Пасля таго як на фоне лячэння прыкметы дэпрэсіі зніклі, неабходна працягнуць прыём антыдэпрэсанту на працягу 4—6 месяцаў. Гэта дапаможа захаваць дасягнуты эфект. Не варта прымаць карвалол, транквілізатары — яны не валодаюць антыдэпрэсіўным дзеяннем. Унясіце ў жыццё больш задавальненняў.

Вельмі часта на дэпрэсіі пакутуюць людзі, якія прад'яўляюць да сябе высокія патрабаванні, «трымаюць сябе ў яжовых рукавіцах». Заўсёды старайцеся знайсці час і грошы на прыемныя забаўкі: падарожжа, куплю новай рэчы, цікавае знаёмства, прагляд цікавага фільма, добрую ежу. Любіце сябе і падтрымлівайце высокі ўзровень самапавагі.

Не будзьце адзінокія — старайцеся наладжваць добрыя міжасобасныя адносіны, кантактаванне абараняе чалавека ад дэпрэсіі. Падтрымлівайце добрую фізічную форму. Правільна і рэгулярна харчуйцеся, трымайце пастаянную вагу, сачыце за сваім целам, пазбягайце злоўжыванні алкаголем. Сачыце за сваім псіхічным станам. Дэпрэсія не пачынаецца за адзін дзень. Калі вы адчулі яе набліжэнне, наведайце ўрача, працягніце на некаторы час прыём антыдэпрэсанту.

# Кіпень, разеткі, запалкі...

## Як уберагчы дзяцей ад апёкаў

**Сярод усіх траўмаў у дзяцей апёкі займаюць значнае месца. Малыя і школьнікі, вельмі дапытлівыя, спазнаюць свет і не могуць быць застрахаваны ад непрыемнасцяў. Статыстыка сведчыць, што найчасцей апёкавыя траўмы атрымліваюць дзеці ва ўзросце да 5 гадоў. Прычым пераважная частка гэтых траўмаў (93 %) адбываецца дома. Немаўляты і дзеці да 5 гадоў маюць надзвычай далікатную скуру, якая траўміруецца нават пры такіх тэмпературах, якія не прычыняюць шкоды дарослым.**

— Найболей часта тэрмічныя пашкоджанні сустракаюцца ў дзяцей першых трох гадоў жыцця, што тлумачыцца асаблівасцю іх паводзін і недаглядам бацькоў. Галоўным чынам гэта апёкі пры апарванні кіпенем, з прычыны кантакту з распаленымі прадметамі, крыніцамі току. З узростам прычына атрымання тэрмічнай траўмы мяняецца, і на першы план выступаюць апёкі, атрыманыя пры неасцярожным абыходжанні з агнём і гарачымі матэрыяламі. Апёкі пры пажарах прыводзяць да высокай смяротнасці і інваліднасці, — кажа **ўрач-траўматолаг-артапед, загадчык хірурга-траўматолага-артапедычнага аддзялення 25-й гарадской дзіцячай паліклінікі горада Мінска Вадзім КРЫВЕЛА.**

Дзеці першых гадоў жыцця ў сваёй большасці атрымліваюць апёкі дома. З павелічэннем узросту, у прыватнасці ў падлеткаў, апёкі пераважна здараюцца на вуліцы. Дзеці ўсіх узростаў у хатніх умовах часцей апбальваюцца на кухні, з узростам эпіцэнтр пераносіцца ў ванны пакой. Вось якія меры перасцярогі варта захоўваць у кожным з пакояў.

### ВАННЫ ПАКОЙ: АСЦЯРОЖНА З ГАРАЧАЙ ВАДОЙ

• Правярайце тэмпературу вады ў ванне перад купаннем дзяцей. Спачатку адрэгулюйце халодную, затым гарачую.

• Не купайце малога, пакуль гарачыя і халодныя пласты вады ў ваннай не змяшаюцца.

• Ніколі не купайце нованароджаных і дзяцей першага года жыцця ў гарачай вадзе. Памятайце: іх скура больш далікатная, чым ваша.

• Не пакідайце дзяцей адных у ванне. Застаўшыся без нагляду, малое можа павярнуць кран з гарачай вадой і атрымаць апёк.

### СПАЛЬНЯ: ЛОЖАК УДАЛЕЧЫНІ АД РАЗЕТАК

• Стаўце дзіцячы ложак на бяспечнай адлегласці ад крыніц цяпла і электрычных разетак.

• Трымайце ўбаку ад дзіцячых ложкаў і фіранак адкрытыя крыніцы цяпла.

• Не пакідайце электрычныя шнуры! Прыбірайце іх ад дзяцей.

• Ніколі не курыце ў ложку!

### КУХНЯ: ТРЫМАЙЦЕ ПАТЭЛЬНІ БЕЗ РУЧАК

• Падчас гатавання ежы не выпускайце з поля зроку малога.

• Гатуйце ежу толькі на далёкіх канфорках. Гэта дасць магчымасць своечасова прадухіліць перакульванне каструль з кіпенем на дзіця.

• Трымайце патэльні без ручак, каб дзеці не маглі іх на сябе перакуліць.

• Не захоўвайце ежу, асабліва прысмакі, на пліце, бо дзеці могуць забрацца на пліту, каб іх дастаць.

• Не пакідайце ёмістасці з гарачымі вадкасцямі на краі стала ці пліты.

• Не пакідайце свабодна вісячыя электрашнуры. Згортвайце электраправады для таго, каб дзеці не маглі перакуліць на сябе электрапрыборы. Малыя ва ўзросце ад 10 да 20 месяцаў вучацца хадзіць, пры гэтым яны спрабуюць схапіцца за самыя разнастайныя прадметы, якія дапамаглі б ім захаваць вертыкальнае становішча. Электраправады тояць для іх вялікую небяспеку.

• Устаўце ахоўныя прылады на разеткі, каб пазбегнуць трапляння ў іх пальцаў дзяцей.

### ЗАПАЛКІ — НЕ ЗАБАЎКА

• Запалкі і крыніцы агню павінны знаходзіцца па-за межамі дасягальнасці дзяцей. Узрост з 3 да 5 гадоў — час захаплення запалкамі. Дашкольнікаў вельмі цікавіць палачка, якая пры запальванні дае полымя, цеплыню, святло. Яны не бачаць нічога дрэннага ў адкрыцці новых бакоў навакольнага свету. З 5 гадоў вучыце дзіця, што запалкі — гэта прылада, навучыце з імі абыходзіцца.

• Не пакідайце падпаленыя свечкі без нагляду.

• Захоўвайце ядавітыя хімічныя рэчывы ў бяспечным месцы.

• Пры наяўнасці газавых пліт, калі вы адчулі пах газу ці падазраяце яго ўцечку, адкрыйце дзверы ці акно, праветрыце памяшканне і выключце газавую ці пажарную службу. У гэты час не запальвайце запалкі, не ўключайце электрычнасць.

• Ніколі не захоўвайце бензін ці іншыя лёгказагаральныя вадкасці ў доме.

# БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Изолированное помещение № 3 (назначение – помещение финансового назначения) общей площадью 149,5 кв. м, расположенное на 1-м этаже здания бизнес-центра «Виктория» в г. Минске, по пр-ту Победителей, 59** |
| **Начальная цена продажи** | 544 887,39 рубля (пятьсот сорок четыре тысячи восемьсот восемьдесят семь рублей) 39 копеек с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 5 448,87 рубля (пять тысяч четыреста сорок восемь рублей 87 копеек) |
| **Обязательные условия** | Новому собственнику заключить с ОАО «АСБ Беларусбанк» договор аренды части изолированного помещения (ориентировочно 10 кв. м), необходимой для размещения отделения ОАО «АСБ Беларусбанк» № 514/400, в соответствии с нормами Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150; установить за счет средств нового собственника перегородки для выделения отделения |
| **Открытый аукцион состоится** | **11.10.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, актовый зал (6-й этаж)** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | **В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 07.10.2022 включительно по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 602 (тел.: (017) 2794655, (017) 2794930)** |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи, обращаться по телефонам: (017) 279 46 55 – Сосновский Дмитрий Викторович, (017) 279 47 74 – Баёк Павел Александрович |

*Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 07.10.2022 включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.*

<u>К заявлению также прилагаются:</u>

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель открытого аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение с инвентарным номером 400/С-4486 (назначение – здание специализированное транспорта, наименование – мастерские), общей площадью 536,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4В.**

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001010539, площадью 0,4552 га (назначение – земельный участок для обслуживания мастерской), находящемся по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4В.

Начальная цена продажи лота – 215 000 руб. (двести пятнадцать тысяч рублей) с учетом НДС.

Лот 1 имеет обременения со стороны третьих лиц:
- в виде аренды части здания: площадью 59,6 сроком по 31.12.2022 г.;
- в виде аренды части асфальтобетонного покрытия: площадью 270,0 сроком по 31.12.2022 г.;
- сервитута на земельный участок, площадью 442,0 кв. м сроком по 31.12.2023 г.

Сумма задатка – 21 500 руб. (двадцать одна тысяча пятьсот рублей)

Продавец – Строительное унитарное предприятие «Гродненская СПМК», 230003, г. Гродно, ул. Озерское Шоссе, 20А, тел. 607-901

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB301205008 33225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 07 октября 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 05 октября 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **Пуховичский лесхоз, Минская область, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 14, УНП 600187881, тел. +375 1713 34317** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение – г. Марьина Горка, ул. Калинина, д. 14**

| Лот № | Марка, модель | Год выпуска | Инвентар. номер | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | **МПТ 461.1, р/зн ОМ-5 0798,** зав. № 445 Шасси МТЗ Л82.2 серийный № 72000975 | 2009 | 01200006 | **16 560,00** |
| **2** | **МПТ 461.1, р/зн ОМ-5 1651,** зав. № 444 Шасси МТЗ Л82.2 серийный № 72000973 | 2009 | 01200003 | **27 960,00** |
| **3** | **Грузовой специальный сортиментовоз МАЗ-631708-1244 АО 4075-5** (№ кузова Y3M631708E0001050) **и прицеп спец. сортиментовоз МАЗ-837810-(022) А 6812 В-5** (№ кузова Y3M837810E0015654) | 2014 | 01250370, 01250371 | **51 720,00** |
| **4** | **Грузовой специальный сортиментовоз МАЗ 6303А8, АН 1503-5** (№ кузова Y3M6303A8C0001637) **и прицеп спец. сортиментовоз МАЗ-837810-(022), А 4478 В-5** (№ кузова Y3M837810D0015180) | 2012 2013 | 01250220, 01250221 | **31 440,00** |
| **5** | **Трактор МТЗ Л82.2-02, ОВ-5 1611** (зав. № 72000711) **и полуприцеп ПЛ-9, БШ 7039** (зав. № 250) | 2008 | 01240168 | **27 000,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390. **Срок внесения задатка – по 07.10.2022**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 10.10.2022.**

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **07.10.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу от 07.09.2022**

**Контактные телефоны:** +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. **E-mail:** auction@cpo.by

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197», г. Молодечно

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Мотобур ВТ 360 | 1764,00 | 176,40 | 88,20 |
| 2 | Нивелир лазерный БОШ линейный | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 3 | Станок 8Г | 2016,00 | 201,60 | 100,80 |
| 4 | Станок СМЖ | 588,00 | 58,80 | 29,40 |
| 5 | Пресс-ножницы | 2940,00 | 294,00 | 147,00 |
| 6 | Вагон-бытовка строительная | 823,20 | 82,32 | 41,16 |
| 7 | Вагон-бытовка строительная | 1176,00 | 117,60 | 58,80 |
| 8 | Вагон-бытовка строительная | 1260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 9 | Вышка строительная сборно-разборная передвижная ВСРП-2500-20 | 756,00 | 75,60 | 37,80 |
| 10 | Компьютеры, согласно списку 1: https://docs.google.com/document/d/1JzbpKeJTzQE4Z9CrgAdLod5NMS7Vcahx/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1437,71 | 143,77 | 71,89 |
| 11 | Кап. строение (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – одноэтажное кирпичное здание конторы) с инв. № 630/С-39007, общей площадью 335,3 кв. м, с составными частями и принадлежностями (три навеса); система пожарной сигнализации; мебель, согласно списку 2: https://docs.google.com/document/d/1JfGDgll07rVeKKkVpMHVTxKuAb91IAXi/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 160483,57 | 16048,36 | 8024,18 |
| 12 | Оборудование, согласно списку 3: https://docs.google.com/document/d/1EuWvjcW5KZJsl4iM5STLhFMh1QlXcAww/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 7858,51 | 785,85 | 392,93 |
| 13 | Кап. строение (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – двухэтажное кирпичное здание базы) с инв. № 630/С-38998, общей площадью 870,5 кв. м; мебель, согласно списку 4: https://docs.google.com/document/d/1OuPLBa0AxoC8WSqv1QTePYtLqxJ8zovu/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 226 696,53 | 22 669,65 | 11 334,83 |
| 14 | Леса, согласно списку 5: https://docs.google.com/document/d/1iSG4vAz0k2sOJeXe0-m-dfrqv0ut7Zzn/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 2488,67 | 248,87 | 124,43 |
| 15 | Столы каменщика, согласно списку 6: https://docs.google.com/document/d/1uHq2x5x-ZPq_zi6MhDw0uroMSM5E8Pzb/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 2225,99 | 222,60 | 111,30 |

В отношении лотов №№ 1–15 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 30 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 110 (29732) от 08.06.2022, № 138 (29760) от 16.07.2022, стр. 7, № 159 (29781) от 16.08.2022

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **20 сентября 2022 года в 15.30 (регистрация с 15.00 до 15.25) по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1** |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 07.09.2022 до 16.00 16.09.2022 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Местонахождение имущества** | **Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1** |

**Условия для участия в торгах:** 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901** Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, проводимых __.__.2022.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам 1–10, 12, 14–15 составляет 7 % от конечной цены предмета торгов; по лотам 11, 13 составляет 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Татьяне Степановне (+375291877401).** По вопросу наличия обременений обращаться к Артуру, +375293396845. **Дополнительная информация по лотам №№ 1–10, 12, 14, 15 по тел. +375293042560, Андрей, по лотам №№ 11, 13 – по тел. +375293082762, Екатерина.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляются Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Строитель-197», г. Молодечно (Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1) в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 339-68-45 (Артур)** |

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

7 верасня 2022 г. № 34 (670)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



Фота Назара Халько.





# САПОЦКІН НА ШЛЯХУ ПЕРАМЕН

## Ці стане новы брэнд пунктам адліку ў прыгранічным пасёлку?

**Гарадскі пасёлак Сапоцкін Гродзенскага раёна ўключаны ў праграму перспектыўнага развіцця як населены пункт будучыні. Гэта значыць, што ён павінен стаць прыкладам для іншых і развівацца па спецыяльным праекце. Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў гарадскім пасёлку, каб ацаніць яго сучасны стан і даведацца, што чакае Сапоцкін найбліжэйшым часам. У сувязі з гэтым паўстала шэраг пытанняў.**

### Як затрымаць турыста?

Ад Гродна да пункта прызначэння ўсяго 25 кіламетраў. Дзякуючы выдатным дарогам, дабіраемся літаральна за паўгадзіны. З дарогамі Сапоцкіну пашанцавала. Траса атрымала пакрыццё дзякуючы шэрагу трансгранічных праектаў, накіраваных на дарожную інфраструктуру Аўгустоўскага канала. Аб тым, што мы едзем у дадзеным напрамку, сведчаць і дарожныя ўказальнікі.

Сапоцкін можна назваць брамай канала. Ад пасёлка да папулярнага шлюза Дамброўка напрасткі ўсяго тры кіламетры, па трасе — каля дзесяці. І гэта акалічнасць, з аднаго боку, спрыяе прытоку сюды турыстаў, а з другога — патрабуе пэўных дзеянняў па іх затрыманні. Як гэта зрабіць? Вядома, прапанаваць турыстам нешта цікавае. Тое, чаго больш нідзе няма. Менавіта такі кірунак і стаў адпраўным пунктам пры фарміраванні вобраза «пасёлка будучыні». Для пачатку ўспомнілі старажытныя сапоцкінскія традыцыі роспісу велікодных яек, якія нават атрымалі статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Гэта дало падставу стварыць тут Музей пісанкі з правядзеннем майстар-класаў. Цяпер сюды можна завітаць і ўразіцца народнай творчасцю.

У інфармацыйным цэнтры даведваемся аб гісторыі Сапоцкіна, якая налічвае пяць стагоддзяў. Існуе версія, што літоўскі князь Сігізмунд у 1514 годзе гэтыя землі аддаў свайму паплечніку Мікалаю Сапоцьку. Магчыма, ад яго і пайшла назва пасёлка. З гістарычных аб'ектаў тут знаходзіцца каталіцкі храм XVIII стагоддзя, капліцы двух шляхецкіх родаў, адны з самых старых у Беларусі яўрэйскія могілкі. Усе аб'екты адносяцца да гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Аказваецца, да вайны Сапоцкін быў райцэнтрам, у склад якога ўваходзіў і польскі Беласток. Былая гісторыя адлюстравана і ў назвах вуліц: Элізы Ажэшкі, Адама Міцкевіча, Генрыка Сянкевіча, Яна Паўла II, Тэалінская, Аўгустоўская... І, што цікава, тут няма ніводнага шматпавярхоўка, а забудова даволі шчыльная. Як патлумачыў **старшыня Сапоцкінскага сельвыканкама Андрэй САДКОЎСКІ**, пасёлак да вайны быў яўрэйскі, а мець зямельныя надзелы забаранялася, таму дамы будавалі амаль упрытык адзін да аднаго.

Мясцовыя ўлады звязваюць развіццё пасёлка з турызмам — знешнім і ўнутраным.

— Гэта стык трох дзяржаў — Беларусі, Літвы і Польшчы, — зазначае Андрэй Садкоўскі. — На балансе сельскага Савета знаходзіцца водны і пешы пагранпераходы. Раней дзейнічаў яшчэ адзін пункт пропуску Кадыш, адкуль вядзе прамая дарога на Калінінград праз Літву. Увогуле, ад Сапоцкіна да літоўскай граніцы 15 кіламетраў, да польскай — 10. Указ аб бязвізавым наведванні Беларусі для грамадзян суседніх краін пашырае турыстычны патэнцыял пасёлка.

Пакуль толькі ў перспектыве, але ідзе гаворка аб стварэнні гарналыжнага комплексу і пляцоўкі для гольфа. Таксама разглядаецца пытанне аб будаўніцтве этнаграфічнай зоны з домікамі для адпачынку. Умовы для інвестараў спрыяльныя — тэрыторыя ўваходзіць у склад свабоднай эканамічнай зоны «Гродна-інвест».

### Дзе выпіць кавы і адпачыць?

Гэта пытанне становіцца актуальным для прыгранічнага Сапоцкіна, будучыню якога звязваюць з развіццём турызму. Вядома, аднымі славутасцямі турыста не прыцягнуць. Патрэбна і адпаведная інфраструктура. На першы погляд здаецца, што гэты кірунак пакуль вымушае жадаць лепшага. Старшыня сельвыканкама расказаў, што год таму ў пасёлку прадпрымальнік адкрыў кафэ і нават выпякае хлеб, які можна набыць у павільёне каля аб'екта. Кафэ так і называецца — «Водар хлеба». Праўда, пазнаёміцца з гаспадаром кафэ не ўдалося, у той момант яго не аказалася на месцы. Выпіць кавы не атрымалася...

Між тым арганізаваць месца адпачынку нескладана, лічыць Андрэй Садкоўскі. Непадалёку прымае гасцей аднаўленая сядзіба роду Гурскіх, якую выкупіў і прыводзіць у парадак мясцовы бізнесмен. Тут ёсць і кафэ, і гасцініца. У навакольных вёсках адкрыліся аграсядзібы, дзе могуць адпачыць да 20 чалавек. Праўда, пры папярэднім заказе. Увогуле, такая сістэма турфірмамі адпрацаваная. І хоць аўтамабільны паток праз Сапоцкін даволі вялікі, ён скіраваны пераважна на Аўгустоўскі канал. У самім пасёлку турыстычны транспарт амаль не спыняецца.

стар. 9





## Імпартазамяшчэнне і сямейныя каштоўнасці

● У Савеце Рэспублікі 31 жніўня на чале са **старшынёй верхняй палаты парламента Наталляй КАЧАНАВАЙ** адбылася нарада з зацікаўленымі па пытанні функцыянавання ААТ «Мотавела». Спікер адзначыла, што кіраўнік краіны не так даўно наведаў мотавелазавод. Падчас сустрэчы з кіраўніцтвам прадпрыемства Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што многія камплектуючыя цяпер закупляюцца за мяжой, і падкрэсліў, што трэба імкнуцца да таго, каб рабіць сваё. Напрыклад, па асобных вырабах лакалізацыя складае каля 20 %, а ва ўмовах цяперашняй абстаноўкі ў свеце, санкцыйнага ціску такі падыход нясе ў сабе пэўныя рызыкі. Аляксандр Лукашэнка ў цэлым застаўся незадаволены ўбачаным, адзначыўшы павольную рэалізацыю да гэтага намечаных планаў. Тым больш што раней пры наведванні мотавелазавода Мінскаму гарвыканкаму была пастаўлена задача навесці там парадак, задзейнічаць нявыкарыстаныя плошчы, а таксама наладзіць эфектыўную работу самога прадпрыемства.



Фота БелТА.

З гэтай нагоды падчас правядзення нарады ў Савеце Рэспублікі зацікаўленыя абмеркавалі прамежкавыя вынікі. Кіраўнік верхняй палаты парламента падкрэсліла, што часу да снежня 2022 года, калі неабходна даць справаздачу перад кіраўніком дзяржавы, застаецца няшмат. Наталля Качанава звярнула ўвагу на сур'ёзнасць заўвагі, якую агучыў кіраўнік дзяржавы.

Старшыня Савета Рэспублікі паведаміла, што рыхтуецца адпаведны пратакол даручэнняў, аднак ужо зараз неабходна прымаць канкрэтныя меры.

● **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** прыняла ўдзел у рабоце дыялогавай пляцоўкі «Дабрабыт сям'і — дабрабыт грамадства!», якая адбылася ў Нацыянальным інстытуце адукацыі па ініцыятыве грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

— Тэматычнае пытанне, якое мы абмеркавалі, толькі на першы погляд падаецца простым і зразумелым. Узаемасувязь паміж шчаслівай сям'ёй, збалансаванымі здаровымі зносінамі ўнутры яе і багаццем нацыі, устойлівым сацыяльна-эканамічным развіццём дзяржавы вельмі складаная і, безумоўна, патрабуе грамадскага абмеркавання, — адзначыла парламентарый.

Таксама сенатар падкрэсліла, што, нягледзячы на глабальныя змены, якія зараз адбываюцца ў свеце, базавыя каштоўнасці і арыенціры застаюцца канстантай.

— Найперш гэта датычыцца сям'і, вядома, у яе традыцыйным разуменні. Сям'я — вялікая адказнасць і пошук пастаянных кампрамісаў. На мой погляд, мужчыну стварэнне сям'і дадаткова дысцыплінуе, стымулюе да асабістага росту, больш інтэнсіўнай працы, каб забяспечыць сваіх родных, каб яны ні ў чым не мелі патрэбы. Лічу, што гэта ў канчатковым выніку адбіваецца і на макраўзроўні, на тэмпах развіцця эканомікі, — выказала меркаванне Таццяна Рунец.

У рамках работы дыялогавай пляцоўкі з удзелам экспертаў, прадстаўнікоў мясцовых органаў улады былі разгледжаны дзейныя эканамічныя механізмы падтрымкі сем'яў у Беларусі, у тым ліку маладых і шматдзетных.

**Арына КАРПОВІЧ.**

СУПРАЦЬ ЗАЛЕЖНАСЦІ

# НЕ ТОЛЬКІ ПРАЦАТЭРАПІЯ

**У Савеце Рэспублікі на пасяджэнні рабочай групы па ўдасканаленні прававога рэгулявання адносін у сферы прафілактыкі правапарушэнняў абмеркавалі пытанні, якія датычацца асацыяльных груп грамадства. Спікеры ўнеслі шэраг прапаноў па ўдасканаленні падыходу па рэабілітацыі і сацыялізацыі асоб, якія сістэматычна злоўжываюць алкагольнымі напоямі і наркатычнымі сродкамі.**


Фота БелТА.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** звярнула ўвагу: пытанне, што датычылася п'янства і алкагалізму ў краіне, а таксама ўчынення злачынстваў на гэтым фоне, было закранута падчас даклада ў кіраўніка дзяржавы. Таму было прынята рашэнне стварыць рабочую групу, у якую ўвайшлі прадстаўнікі розных міністэрстваў і ведамстваў, намеснікі старшынь аблвыканкамаў, якія курыруюць пытанні сацыяльнай сферы.

— У Савеце Рэспублікі мы на сістэмнай аснове займаемся гэтымі пытаннямі. Праводзілі выязныя прэзідыумы, дыялогавыя пляцоўкі, нарады. Разумеем, што ў кожнай краіне ёсць праблемы, звязаныя са злачынствамі, якія здзейсненыя ў стане алкагольнага, наркатычнага ап'янення, — адзначыла Наталля Качанава. — Але сітуацыя складваецца такім чынам, што трэба прымаць больш сур'ёзныя меры да асоб, якія злоўжываюць алкаголем, спажываюць наркотыкі і не даюць спакойна жыць не толькі сям'і, але і ўсім, хто знаходзіцца побач.

Зыходзячы з сітуацыі, якая склалася, МУС агучыў шэраг прапаноў па ўдасканаленні падыходаў, якія, у прыватнасці, звязаны з работай лячэбна-працоўных прафілакторыяў. Асаблівая ўвага ўдзяляецца грамадзянам, якія маюць праблемы, звязаныя з ужываннем алкаголя і наркатычных сродкаў, і пры гэтым не жадаюць працаваць. Гаворка ішла аб спрашчэнні парадку накіравання асоб у ЛПП.

У сваю чаргу Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што карэктывы ў адпаведны закон ужо ўносіліся:

— Падыход мусіць быць комплексны. Адна справа — накіраваць у ЛПП. З іншага боку, трэба разумець, што дзяржава траціць грошы на знаходжанне там гэтых людзей. Значыць, яны там павінны працаваць, а пасля выхаду з гэтай установы важна бачыць вынік. Але ці ёсць сёння такі вынік?

Наталля Качанава падкрэсліла, што ў выніку, калі далейшыя рашэнні на падставе прапаноў МУС будуць прымацца, яны павінны быць сапраўды эфектыўнымі:

— Гэта павінны быць не паўмеры. Тым больш што Прэзідэнт, ставячы задачы, заўсёды патрабуе дэтальнага разгляду ўсіх прапаноў па змяненні заканадаўства. Адпаведныя пытанні будуць разглядацца на пасяджэнні экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі, — падсумавала спікер.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# ГУТАРКА СА СПІКЕРАМ

**Прамая тэлефонная лінія Старшыні Савета Рэспублікі ў апошні дзень жніўня стала своеасаблівым працягам прыёму грамадзян, які адбыўся напрыканцы ліпеня. Тады паступіла больш за 200 заявак, падчас сустрэчы ў Савеце Рэспублікі было разгледжана каля 50 пытанняў. Кантакты грамадзян, у якіх не атрымалася трапіць на прыём, былі захаваны, з усімі звязаліся супрацоўнікі сакратарыята. Наталля КАЧАНАВА адзначыла, што сітуацыя складваецца такім чынам, што ахвотных абмеркаваць сваю праблему вочна ў разы больш, чым тых, хто рэальна можа трапіць на прыём.**

— Трэба разумець: мы не пазбягаем людзей, проста выкарыстоўваем гібкія формы — як асабістыя прыёмы, так і прамыя тэлефонныя лініі: традыцыйныя і ў дадатак да прыёмаў, — звярнула ўвагу спікер.

Падчас прамой тэлефоннай лініі грамадзяне звярталіся да Наталлі Качанавай з рознымі пытаннямі сацыяльнага напрамку. Сярод іх — парадак падліку працоўнага стажа і прызначэнне адпаведнай пенсіі, дапамога ў вырашэнні канфліктаў з нядобрасумленнымі суседзямі, а таксама абскарджанне штрафаў, якія былі налічаны добрапрыстойнаму грамадзяніну памылкова. Наталля Качанава паабяцала дэтальна разабрацца па кожным пытанні і па магчымасці вырашыць праблему заяўніка, у тым ліку перадаўшы справу ў адпаведныя інстанцыі.

**Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і ўнутраным кантролі Савета Рэспублікі Максім ШЭКО** паведаміў, што, у адрозненне ад стандартнай прамой тэлефоннай лініі, на гэты раз тэлефанаваў не грамадзянін, які загадзя запісаўся ў ліпені, а напрамую спікер ва ўзгоднены час.

— Мы бачым, што для грамадзян гэта зручна: не трэба адпрошвацца з працы, шукаць, з кім пакінуць дзяцей, асабліва шматдзетным сем'ям гэта актуальна, — адзначыў Максім Шэко. — Сёння з 30 прынятых такім чынам чалавек былі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны, некаторыя з іх — на істотнай адлегласці.

У Савеце Рэспублікі запэўнілі, што падобнае ўзаемадзеянне з грамадзянамі не азначае адмены звыклых фарматаў: асабістых і выязных прыёмаў.

**Арына КАРПОВІЧ.**

МАЛАДЗЁЖНЫ ПАРЛАМЕНТАРЫЗМ

# ІНІЦЫЯТЫВЫ НА КАРЫСЦЬ КРАІНЫ

**Усё актыўней у Беларусі развіваецца парламенцкі рух, арыентаваны на развіццё творчых, арганізатарскіх і кіраўнічых навыкаў моладзі. Маладыя людзі з усёй краіны аб'ядноўваюцца для рашэння сумесных праблем, для паляпшэння якасці адукацыі, адпачынку і дапамогі дзяржаўнаму апарату, прапаноўваюць інавацыйныя рашэнні, якія садзейнічаюць дабрабыту краіны. У чым заключаецца работа маладзёжнага парламента, як маладыя дэпутаты ўзаемадзейнічаюць з уладай, што запланавана да канца 2022 года — пра гэта і іншае ішла размова на прэс-канферэнцыі «Маладзёжны парламенцкі рух у Беларусі: актуальныя вынікі і перспектывы развіцця».**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ,** на працягу апошніх гадоў Савет Рэспублікі актыўна займаецца выбудоўваннем сістэмы маладзёжнага парламентарызму ў Беларусі. Па меркаванні сенатара, вынікі работы маладзёжнага парламента першага склікання аказаліся значнымі. Нядаўна выбраны новы склад маладзёжнага парламента другога склікання.

— У нашай моладзі выклікае цікавасць удзел у парламенцкім руху рознага ўзроўню — раённага, абласнога, рэспубліканскага. Юнакі і дзяўчаты цікавяцца, як можна трапіць у гэтыя структуры. На маю думку, неабходна далучыць максімальную колькасць моладзі да грамадскай работы, рэалізацыі асабістых ініцыятыў на карысць краіны, — падкрэсліў Віктар Лісковіч. — Needзарма Прэзідэнт шмат увагі ўдзяляе развіццю маладзёжнай палітыкі, ролі моладзі ў рэалізацыі ініцыятыў, якія рухаюць наперад грамадства. На сёння звыш 50 маладзёжных парламенцкіх структур функцыянуе ў Беларусі. У маладзёжным парламенце — прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны. Гэта вельмі важна, паколькі садзейнічае інфармаванасці аб дзейнасці маладзёжнага парламента. Вакол прадстаўнікоў парламентарыяў на месцах будзе фарміравацца дзейнасць іншых парламенцкіх структур.

Віктар Лісковіч нагадаў, што сёлета, у Год гістарычнай памяці, маладзёжным парламентам праведзена шмат тэматычных мерапрыемстваў, у прыватнасці «Цягнік памяці», які аб'яднаў 200 старшакласнікаў. Яны наведалі мясціны, дзе ішлі абарончыя і наступальныя баі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Усе ўдзельнікі выказалі жаданне стаць валанцёрамі ў падобных праектах.

**Старшыня маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ** расказаў, што другое скліканне пачало работу 5 жніўня. Памяняліся структура і склад маладзёжнага парламента. У папярэднім скліканні было 70 чалавек, у цяперашнім — 138, замест 6 профільных камісій стала 10, быў адзін намеснік старшыні, цяпер два. Прэзідыум раней прадстаўляла 8 чалавек, зараз — 13.

— Парламентарыі ажыццяўляюць дзейнасць на добраахвотных пачатках, не атрымліваюць платы. Гэта людзі, якія хочуць працаваць на карысць грамадства, уносіць уклад у развіццё маладзёжнага парламентарызму, — падкрэсліў Мікіта Рачылоўскі. — Мы працуем з дэпутацкім корпусам, сенатарамі, прымаем удзел у прамых тэлефонных лініях, прыёмах грамадзян. У жніўні самі ініцыявалі дадаткова чатыры такія мерапрыемствы.

Як адзначыў Мікіта Рачылоўскі, у верасні маладзёжны парламент пачынае чацвёрты набор платформы «Каманда будучыні». Усе ахвотныя могуць падаць заяўку і прыняць удзел у мерапрыемствах, якія даюць магчымасць навучыцца прамоўніцкаму майстэрству, працаваць на камеру, публіку, у СМІ, мадэліраваць розныя сітуацыі, весці дзелавыя перамовы, прайсці трэнінгі па дрэс-кодзе. Аднаўляецца работа дыялогавай пляцоўкі «Беларусь будучыні», якая накіравана на абмеркаванне актуальных тэм у жыцці беларускага грамадства і маладзёжнага асяроддзя. У яе межах плануюцца сустрэчы з працоўнымі калектывамі, рабочай моладдзю. Распрацаваны два новыя праекты, якія стануць традыцыйнымі. Першы — адзіны парламенцкі дзень у каледжах і школах. Другі — Беларуская маладзёжная ліга дэбатаў. У гэтым годзе плануецца правесці другі беларускі парламенцкі форум.

— У распрацоўцы праект па стварэнні інфамацыйна-адукацыйнай тэлевізійнай праграмы «Здароўе берагчы з маладосці», — паведаміла **старшыня камісіі маладзёжнага парламента па сацыяльнай палітыцы і ахове здароўя Вольга УШКЕВІЧ.** — Фарміраванне ўстаноўкі на здаровы лад жыцця — вельмі важны аспект: здароўе — справа не толькі медыкаў, але і ўсіх грамадзян. Толькі здаровая нацыя можа і будзе развівацца.

Старшыня камісіі маладзёжнага парламента па міжнародных справах Аліна Рацькова засяродзіла ўвагу на перспектывах міжнароднага супрацоўніцтва, кардынацыі ўзаемадзеяння з маладзёжнымі парламентамі і структурамі замежных дзяржаў, удзеле членаў парламента ў праграмах міжнароднага супрацоўніцтва, развіцці маладзёжнай публічнай дыпламатыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# РЭЦЭПТ ЗДАРОЎЯ АД ДЭПУТАТА,

## або Што дапамагло камандзе Магілёўскага гарсавета перамагчы на летняй абласной спартакіядзе-22



**Для старшыні Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Максіма ГУРЫНА словазлучэнне «фізічная культура» не пусты гук. Нават пры вялікіх загрузках ён знаходзіць хвілінку наведаць трэнажорную залу або плаваць у басейне. Лічыць, што толькі дзякуючы фізічнай актыўнасці ні разу за час сваёй працоўнай дзейнасці не быў на бальнічным. І тое, што каманда Магілёўскага гарсавета стала абсалютным пераможцам сёлетняй спартакіяды, для яго вялікі гонар. Бо тут спалучыліся і спартыўны дух, і адчуванне таварыскага пляча, і воля да перамогі...**

### Спартыўныя сустрэчы

Абласная спартакіяда ў Кіраўску стала 12-й па ліку. Яе арганізатарамі традыцыйна выступілі Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў і Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. У спаборніцтвах удзельнічалі 23 каманды з усіх раёнаў, а таксама Магілёва і Бабруйска. Перад народнымі абраннікамі стаяла задача праявіць сябе ў валейболе, лёгкай атлетыцы, шашках, настольным тэнісе, эстафеце, асабістым першынстве па падцягванні і скакалцы, у конкурсах «Меткі футбаліст» і мастацкай самадзейнасці. Кубак абсалютнага пераможцы камандзе Магілёўскага гарсавета дастаўся ўпершыню. Наколькі гэта дасягненне важнае для дэпутатаў?

— Дэпутацкая спартакіяда для каманды перш за ўсё — адчуванне адказнасці перад таварышамі, — разважае Максім Гурын. — Для дэпутацкага корпуса вобласці — гэта нагода для стасункаў у нефармальнай абстаноўцы, магчымасць абмеркаваць працоўныя моманты, падзяліцца вопытам. Мы працуем дзеля адной ідэі, і цікава даведацца, чым дыхае той ці іншы раён, якія там праблемы, як яны вырашаюцца.

Вядома, азарт ёсць. Без гэтага немагчыма ніводнае спаборніцтва. Але крэатыўны падыход вітаецца. Сёлета, напрыклад, дэпутаты Магілёўшчыны прысвяцілі спартакіяду Году гістарычнай памяці і прыехалі на мерапрыемства сем'ямі. Тут і пераемнасць, і адзінства ў адным «флаконе». Асабліва яркімі былі творчыя нумары. Дэпутаты гарсавета падрыхтавалі эпізод на тэму захавання памяці пра Вялікую Айчынную вайну. Іх гісторыя пра 20-гадовага абаронцу Магілёва на Буйніцкім полі, які прапаў без вестак, нікога не пакінула абыякавым. Калі Галіна Бяляева чытае адрасаваныя нашчадкам словы, яе голас пранікае ў самае сэрца. Яна не толькі настаўніца і дэпутат, а яшчэ і пошукавік, сваімі рукамі падняла астанкі не аднаго безыменнага салдата. У нумары задзейнічана шмат моладзі.

— Гэта ў асноўным нашы дзеці, — патлумачыў Максім Гурын. — Мы не проста зрабілі нумар — мы нагадалі, як важна захаваць праўду пра вайну і берагчы мір.

### Воля да перамогі

На прыкладзе сваёй каманды старшыня гарсавета расказвае пра тое, наколькі адказна ставяцца дэпутаты да сваіх абавязкаў.

— Цудоўна згуляла ў тэніс ганаровая грамадзянка Магілёва старшыня гарсавета ветэранаў Зінаіда Пянькова, — кажа ён. — Яна ў творчым нумары стварыла вобраз маці загінулага салдата. Зінаіда Васільеўна з ліку тых, хто заўсёды адгукаецца на просьбу дапамагчы. Яна шмат гадоў аддала грамадскай дзейнасці, у горадзе яе ведаюць і паважаюць. І вельмі каштоўна, што яна падтрымлівае свае спартыўныя навыкі. Малодшае пакаленне бярэ з яе прыклад.



У асабістым заліку высокія вынікі паказаў Ігар Васількоў, якому не было роўных у шашках. Першае месца па лёгкай атлетыцы заняў Віктар Ермакоў, кіраўнік ваенна-патрыятычнага цэнтра Магілёўскага абласнога кадэцкага вучылішча. А настаўнік гісторыі Леанід Шакура ні аднаго разу не «прамазаў», забіваючы гол у вароты, за што перамог у намінацыі «Меткі футбаліст».

— Я хачу падзякаваць усім, хто быў са мной у камандзе, — кажа Максім Гурын. — Акрамя тых, пра каго мы ўжо згадалі, гэта Людміла Ільінская, Алена Аргудзяева, Дзмітрый Голубеў, Міхаіл Кулагін, Віктар Мацієвіч, Раман Крывашэін. У кожным з гэтых людзей можна быць упэўненым. Прыемна, што дэпутаты знаходзяць час для спартыўных заняткаў. Гэта гартуе характар, умацоўвае здароўе, сілу волю.

### Не проста асабістая справа

У абноўленай Канстытуцыі з'явілася норма, дзе гаворыцца, што кожны чалавек павінен клапаціцца пра сваё здароўе.

— І фізічная культура дае такую магчымасць, — перакананы старшыня гарсавета. — Я па сабе адчуваю, што чалавек, які рэгулярна займаецца спортам, больш вынослівы, мэтанакіраваны, згуртаваны. І тое, што прапісана ў Канстытуцыі, вельмі важна. Кожны павінен разумець, што здароўе ў нашых руках. Дзяржава заўсёды падтрымае і дапаможа, але шмат чаго залежыць ад нас саміх. Акрамя таго, што ты ўмацоўваеш свой арганізм, яшчэ і атрымліваеш новыя стасункі, бо ў спартзале можна пазнаёміцца з прадстаўнікамі розных прафесій і поглядаў. Гэта жыццё ў руху. Ты да чагосьці імкнешся, дасягаеш. Так асабістая справа становіцца агульнай. Вельмі важна прыносіць карысць іншым і рабіць свет крышачку лепшым.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара**
**і з архіва Максіма ГУРЫНА.**

# САПОЦКІН НА ШЛЯХУ ПЕРАМЕН

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Зранку праз пасёлак ідуць аўтобусы міжгародні. І гэты рух да самага позняга вечара. У гадзіну — па 2-3 аўтобусы. Паток менавіта беларускіх турыстаў за апошнія тры гады вельмі вялікі. Мяркуючы па нумарах машын, сюды едуць з усіх рэгіёнаў краіны. Штодзень прыбываюць аўтобусы. Беларусы пачалі асвойваць канал актыўна. У сезон усе аграсядзібы заняты. А вось у самім Сапоцкіне экскурсіі праводзяць рэдка, — заўважае старшыня сельвыканкама. — Хоць пагледзець ёсць на што. Я стараюся з прадстаўнікамі турфірмы дамаўляцца, каб яны сюды прывозілі людзей. Не заўсёды сустракаю паразуменне.

У самім Сапоцкіне гасцініцы пакуль няма. Ішла размова, каб пераабсталяваць пад гэтыя мэты былы ўніверсам. Але інвестараў не знайшлося, а частку будынка набыла адна з гандлёвых сетак для сваёй крамы. Другая палова пакуль пустуе, хоць фасад адрамантаваны і месца даволі прывабнае — самы цэнтр пасёлка.

### Што за фасадам?

Сапоцкін — пасёлак невялікі. Тут пражывае крыху больш за тысячу чалавек. З прамысловасці — толькі мясны перапрацоўчы цэх. Між тым інфраструктура пасёлка мае даволі добры ўзровень. Ёсць тут свая бальніца, два дзіцячыя садкі, вялікая школа, пункт аказання бытавых паслуг, прыгожы Дом культуры. На тэрыторыі сельскага Савета працуе 36 устаноў і арганізацый, у тым ліку два сельскагаспадарчыя кааператывы, лясніцтва, пагранічная застава, ратавальнікі. Дарэчы, сёлета пачаў дзейнічаць новы будынак раённай службы МНС, які пабудаваны ў рамках трансгранічнага праекта.

— Паўсюды патрэбны кадры, — агучвае суразмоўца важную праблему. — Сапоцкін адчувае патрэбу ў працоўных рэсурсах. Іх нам трэба больш. Значная частка мясцічаў даволі сталага ўзросту, з тысячы чалавек амаль 30 працэнтаў пенсіянеры. Усе, хто хоча працаваць, могуць знайсці сабе працу. Пакуль сюды прыязджае значная частка гараджан. Ёсць і перасяленцы, але іх мала, і я рады, што насельніцтва такім чынам прыбывае.

Пасёлак мае добрыя транспартныя зносіны з абласным цэнтрам. Ідуць як аўтобусы аўтапарка, так і маршруткі. Для паляпшэння якасці вады ўстаноўлена станцыя абезжалезвання. На пачатку зімовага сезона ідзе праверка вулічнага асвятлення. Газіфікавана пакуль толькі трэцяя частка дамоў, а іх усяго больш за 500.

### Куды накіроўваюцца сродкі?

За апошнія некалькі гадоў зроблена нямала. Можна сказаць, што Сапоцкін прыняў прэзентабельны выгляд. Андрэй Садкоўскі праводзіць невялікую экскурсію па яго цэнтры. У вочы кідаецца дзіцячая пляцоўка каля будынка сельвыканкама. Далей, у парку, падыходзім да тэніснага стала і трэнажораў.

— Наш пасёлак тры гады таму стаў пераможцам у рэспубліканскім конкурсе па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Мы занялі першае месца. За фінансавую прэмію зрабілі антывандальны трэнажорны комплекс з настольным тэнісам, пашырылі дзіцячую пляцоўку, абсталявалі валейбольную, і яна вельмі папулярная, — расказвае старшыня сельвыканкама. — Сродкаў хапіла і на наваговоднюю ілюмінацыю.

Сельскі Савет амаль кожны год займае прызавыя месцы на адпаведных конкурсах у Гродзенскім раёне. Атрыманыя сродкі ўкладваюцца ў добраўпарадкаванне гарадскога пасёлка, у тым ліку дарожнае пакрыццё. Напрыклад, сёлета зрабілі дзве пешыя дарожкі да школы, якіх раней не было. На гэтыя мэты ідуць і сродкі ад продажу зямельных участкаў. Згодна з генпланам, на ўскрайку Сапоцкіна вызначана новая зона жылой забудовы. Тут ужо вырасла цэлая вуліца, якая так і называецца — Новая.

За апошнія тры гады праведзена 8 аўкцыёнаў, на якіх



прададзена 20 участкаў і два пустыя дамы. Іх кошт у сярэднім складае 7-8 тысяч рублёў. Выдзелены 4 зямельныя ўчасткі тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Ёсць попыт і на тыя ўчасткі, гаспадары якіх не змаглі іх своечасова абсталяваць. Гэтыя фінансы таксама ідуць на добраўпарадкаванне.

Сельскі Савет неаднойчы прымаў удзел у праектах трансгранічнага супрацоўніцтва. Два з іх рэалізаваны літаральна нядаўна. Вынікам аднаго стала ўстаноўка святлодыёднага экрана каля сельвыканкама, а другога — афармленне дарожнай стэлы на ўездзе ў Сапоцкін. Яшчэ тут плануюць устанавіць выкаваны з металу надпіс «Шчыра вітаем».

— Мы звязваем надзеі з развіццём Аўгустоўскага канала, — кажа старшыня сельвыканкама. — Ёсць тэрыторыя, якая спецыяльна адведзена для рэалізацыі бізнес-планаў. Хто хоча сябе рэалізаваць, можа гэтым заняцца. Пакуль больш плённа працуюць аграсядзібы. Іх у наваколлі пятнаццаць, і гэта перспектыўны напрамак для развіцця турыстычнай сферы.

На развітанне старшыня сельвыканкама заўважыў, што зрухі за апошні час відавочныя. І гэта радуе. Хоць і складана працаваць, але Сапоцкін выйшаў з занепаду і набывае рысы сучаснага населенага пункта — утульнага, камунікацыйнага і гасціннага.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
*г. п. Сапоцкін.*
**Фота Назара ХАЛЬКО.**

З НАГОДЫ

# КАЛІ АДКРЫВАЮЦЦА ТАЛЕНТЫ

## На свяце вёскі ў Тэўлях арганізавалі шыкоўную выставу



**У Тэўлях на Дзень вёскі сабраліся і старыя, і малыя. Дзень гэты супаў са святам Успення, таму пачалі яго са святочнага богаслужэння ў мясцовым Свята-Успенскім храме, які, дарэчы, сёлета адзначае 150-годдзе. Зранку памаліліся, згадалі таксама загінулых на войнах землякоў, усклалі кветкі да помнікаў, а пасля абеду разам адсвяткавалі.**

Аўтарам сцэнарыя святочных мерапрыемстваў выступіла **загадчыца клуба Алена МАРЧУК.** Паводле яе слоў, душой сёлетняга свята можна без перабольшвання назваць выставу творчасці мясцовых людзей.

— Здаецца, жывём побач, ведаем адно аднаго, але бывае, што знешне звычайныя людзі тояць у сабе сапраўдныя скарбы талентаў, — кажа Алена Мікалаеўна. — Ну, напрыклад, як сям'я Гасцеевых. Тое, што Аляксандр сапраўдны мастак у справе разьбы па дрэве, мы ведалі. Яго вырабы нават упрыгожваюць асобныя элементы нашага храма. А вось Ала Гасцеева раптам прадэманстравала прыгожыя лялькі, звязаныя кручком. І што гэта за лялькі! Каля яе экспазіцыі прыпыняліся ўсе, хто наведваў выставу.

Парадавала творамі наша старэйшая вышывальшчыца Мая Іванаўна Гамола. З-пад іголкі жанчыны выходзяць сапраўдныя творы мастацтва: ручнікі, карціны, абразы. Мая Іванаўна доўга працавала сакратаром сельскага Савета. А да гэтага шчыравала на ніве культуры. У яе ёсць знак «Ганароваму культработніку за выдатную работу», дык вось пасведчанне да ўзнагароды падпісала ў 1965 годзе легендарны міністр культуры СССР Кацярына Фурцава.

...Былі на той выставе карціны, вышытыя бісерам Галінай Бягун; творы, выразаныя з дрэва Уладзімірам Казюрам; арыгінальныя кампазіцыі з газетных трубак, вырабленыя Галінай Быцко. На гэтым вернісажы аднавяскоўцы, як выглядала, яшчэ раз знаёміліся адно з адным, адзначыла Алена Мікалаеўна.

Па традыцыі на святкаванні ўшанавалі самых сталых жыхароў. Старэйшынай населенага пункта па праве названы 97-гадовы Гаўрыла Ульянавіч Зіхманчук, былы вязень фашызму. Заслужаную пашану таксама атрымалі жанчыны, якія перайшлі 90-гадовы рубеж: Марыя Мартысь і Надзея Мех.

А залатыя юбіляры — Валянціна і Аляксандр Балабушка — прымалі віншаванні з 50-годдзем сумеснага жыцця. Валянціна Харытонаўна і Аляксандр Аляксеевіч — былыя працаўнікі сельгаспрадпрыемства. Іх адзначала ААТ «Стрыгава». Гаспадарка, дарэчы, выступіла асноўным спонсарам святкавання.

Не забыліся і пра самых руплівых гаспадароў падворкаў. Старшыня Тэвельскага сельскага Савета Іна Кузняцова назвала Валянціну Іванаўну Шугай кветкаводам на ўсю акругу. Сапраўды, у Валянціны Іванаўны не толькі падворак патанае ў кветках — расквечана ўся вуліца паабапал сядзібы. На шчасце, аматараў прыгажосці знайшлося нямала, іх імёны прагучалі на свяце.

Вялікую работу пры падрыхтоўцы дня вёскі правяла і сельскі бібліятэкар Любоў Крагель. І не толькі выставай краязнаўчай літаратуры, экскурсам у гісторыю населенага пункта парадавала бібліятэка. Любоў Маркаўна стала завадатарам прэзентацыі вуліц. Гэтым разам свае таленты, уменні, кулінарнае майстэрства дэманстравалі жыхары вуліц Чыгуначнай і Працоўнай. А ўсяго ў Тэўлях дзесяць вуліц, і пражывае ў вёсцы каля паўтысячы чалавек.

Свята прайшло на адным дыханні, настрой ствараў народны ансамбль музыкі «Кобрынскі гармонік». А завяршыўся вечар танцамі, дзе людзі старэйшага пакалення нават падавалі прыклад маладым.

Шчыра павіншаваў тэвельцаў са святам вёскі **старшыня Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў Іван ДАЎЖУК.** Пазней Іван Аляксеевіч падзяліўся ўражаннямі з карэспандэнтам газеты:

— Такія святы вельмі патрэбныя жыхарам вёскі. Здавалася б, у сельскай мясцовасці ўсе ведаюць адно аднаго, але гэта і так, і не так. Бо, як упэўніліся, некаторыя з-за сціпласці не асабліва афішыруюць свае хобі, таленты. І аказваецца часам, што сусед наноў адкрывае суседа. Такія сустрэчы здружваюць, дораць незабыўныя эмоцыі. Гэта добрая нагода сказаць прыемныя словы сталым, заслужаным людзям, падтрымаць маладых, проста пабыць усім разам. На свята некаторыя прыйшлі цэлымі сем'ямі, гарадскія дзеці і ўнукі былі разам з бацькамі. У цэлым жа дзень вёскі прайшоў на высокай патрыятычнай ноце.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Кобрынскі раён.*

УНУТРАНЫ ТУРЫЗМ

# НАРАЧАНСКІ КРАЙ ВЯРТАЕ ПАЗІЦЫІ



**МЯДЗЕЛЬСКІ раён набыў статус курортнага з 1960-х гадоў. Тут знаходзіцца самае вялікае возера нашай краіны — Нарач, а ўсяго налічваецца іх 51. Тут шмат унікальных прыродных комплексаў, якія ўяўляюць вялікую цікавасць для эколагаў. Сама прырода Нарачанскага краю натхняе на актыўны адпачынак. Аднак, па словах старшыні Мядзельскага раённага Савета дэпутатаў Алега БАРОЎКІ, у 2020 годзе ўзровень турыстычных паслуг склаў усяго 35 працэнтаў да ўзроўню 2019-га. Так пандэмія на каранавірус адбілася на эканоміцы рэгіёна. У 2021-м сітуацыя пачала паляпшацца. Мы спыталі старшыню райсавета, як ідуць справы сёлета.**

— На тэрыторыі Мядзельшчыны функцыянуюць дзевяць здраўніц, дзе занятыя больш як 2500 спецыялістаў, — расказаў Алег Бароўка. — Эфектыўна працуюць калектывы санаторыяў «Прыазёрны», «Спадарожнік», «Белая Русь», Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня». У ліпені напаўняльнасць санаторыяў перавысіла 100 працэнтаў. На працягу лета былі заняты ўсе аграсядзібы раёна. Кожныя выхадныя турыстычныя стаянкі і месцы, дзе дазволена купанне, былі запоўнены гасцямі з Мінска і іншых гарадоў Беларусі. Сярод замежнікаў пераважаюць расіяне. Бязвізавы рэжым на выхадныя дні выкарыстоўваюць і грамадзяне Літвы, Латвіі. За першае паўгоддзе 2022-га ў санаторна-курортных установах адпачылі 7485 іншаземцаў, а ў цэлым турыстычных паслуг у грашовым эквіваленце склалі 3 145 000 долараў (128 працэнтаў да ўзроўню адпаведнага перыяду 2021-га).

У рэгіёне развіваецца экалагічны, паляўнічы, рэлігійны, медыка-аздараўленчы турызм і караванінг. Распрацаваныя пяць турыстычных і сорак чатыры экскурсійныя маршруты. Сярод самых папулярных аб'ектаў — агратурыстычны комплекс «Наносы-Навaселле», экалагічная сцежка «Блакітныя азёры» і дэндралагічны сад Нацыянальнага парку «Нарачанскі». Гэты ўнікальны сад раскінуўся каля вёскі Нікольцы паміж азёрамі Нарач і Мястра на 16 гектарах. У ім расце 400 відаў дрэў і кустоў, характэрных для розных кліматычных зон планеты. Тут можна наведаць і адзіны ў краіне музей лесу.

Найважнейшымі аб'ектамі рэлігійнага турызму з'яўляюцца Мядзельская кальварыя і Нацыянальны санктуарый — касцёл Маці Божай Будслаўскай у аграгарадку Будслаў. А Будслаўскі фэст унесены ЮНЕСКА ў Спіс каштоўнасцяў нематэрыяльнай спадчыны. Штогод фестываль збірае тысячы паломнікаў.

Прамысловы турызм прадстаўлены ААТ «Вінакурня Нарач» і вытворчым унітарным прадпрыемствам «Ілаўскае». Цікавым аб'ектам з'яўляецца экскурсійна-турыстычны комплекс «Аптэкарскі сад», які належыць адкрытаму акцыянернаму таварыству з такім жа найменнем. У садзе вырошчваюць лекавыя расліны, у тым ліку і рэдкія відаў. А стварыўся ён на прыкладзе манастырскіх садоў Сярэднявечча. У фітагасцёўні варта пакаштаваць чайныя кампазіцыі на травах. Ёсць тут і хацінка бабулі-траўніцы, якая прадказвае будучыню. Прадпрыемства спецыялізуецца на вытворчасці чаю, чайных напіткаў, біялагічна актыўных дабавак, а таксама аказвае экскурсійныя паслугі ў Нарачанскім рэгіёне.

Дарэчы, травяныя чаі можна набыць і ў краме «Ілаўскае», што знаходзіцца ў курортным пасёлку Нарач. Тут жа можна купіць мясныя вырабы ААТ «Занарачанскі», віно, кальвадос, сокі прадпрыемства «Ілаўскае», сыр з блакітнай цвіллю вытворчага ўчастка Мінскага малочнага завода № 1, 97 працэнтаў гэтай прадукцыі ідзе на экспарт.

— У Мядзельскім раёне працуюць 57 аб'ектаў грамадскага харчавання, пяць аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, 20 санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый, паляўнічы комплекс, 113 аграэкасядзіб, 14 турыстычных стаянак, у тым ліку адна кемперная, — паведаміў старшыня райсавета. — Чатыры гады таму ў Мядзеле адкрыўся гасцінічны комплекс, у рамках праграмы развіцця Нарачанскай зоны ў курортным пасёлку Нарач пабудавалі гасцініцу, кожная здраўніца адкрыла па пяць гасцявых домікаў. Для санаторыяў набылі сучаснае медыцынскае абсталяванне, перш за ўсё дыягнастычнае. У раёне працуюць над паляпшэннем якасці паслуг.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У найбліжэйшых планах — будаўніцтва новага спальнага корпуса ў санаторыі «Прыазёрны» (аб'ём інвестыцый — больш як 10 мільёнаў рублёў). Абласной інвестыцыйнай праграмай на 2022—2023 гады прадугледжана ўзвядзенне басейна ў Мядзеле, што сур'ёзна ўмацуе рэйтынгавыя пазіцыі гасцінічнага комплексу «Мядзел» і аднайменнага фізкультурна-аздараўленчага цэнтра.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 6 верасня 2022 года.**

# АДНЫМ ЛЁСАМ З КІНО І ФОТА

## На пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя ў Магілёве здымалі выдатнае кіно

**Кінастудыя «Прамень» была знакавай з'явай для Магілёва. Яе заснавальнік Адам Рагоўскі прымусіў гаварыць пра магілёўскіх кінааматараў далёка за межамі вобласці. Гэты чалавек шмат чаго зрабіў і для фотамастацтва. Сёлета заснавальніку аматарскага фотакінаруху ў Магілёве споўнілася б 100 гадоў. У народным фотаклубе «Вясёлка», каля вытокаў заснавання якога ён стаяў і быў яго першым мастацкім кіраўніком, да гэтай даты падрыхтавалі выставу «Адным лёсам з кіно і фота». Было шмат людзей, цікавых расповедаў і ўспамінаў. Вучні Рагоўскага дзяліліся гісторыямі з жыцця. Некаторыя з іх мы вырашылі пераказаць і нашым чытачам. З іх становіцца зразумела, што Адам Рагоўскі — асоба неардынарная. І, на жаль, яшчэ цалкам не вывучаная і ацэненая.**



Наогул, усё пачалося на пачатку 50-х гадоў, калі медык-рэнтгенолаг магілёўскай чыгуначнай бальніцы Адам Рагоўскі захапіўся фота і стварыў на базе ДК чыгуначнікаў аматарскі фотагурток. А праз пяць гадоў фотавыстава, якую арганізавалі выхаванцы суполкі, нарабіла шмат шуму ў горадзе. Пра гэту падзею з захапленнем пісала ведамасная газета, адзначыўшы, што на выставе пабывала больш за тысячу чалавек. А хутка ў горадзе загаварылі яшчэ і пра кіно. Няўрымслівы Рагоўскі аб'явіў пра адкрыццё кінастудыі, што таксама ўзяў пад свой дах ДК чыгуначнікаў. Ад моладзі, якая жадала далучыцца да новай хвалі, не было адбою. Але конкурс, кажуць, праходзілі не ўсе. Бо на той час, каб зняць фота, а тым больш кіно, трэба было ў прамым сэнсе слова папрацаваць. Няпростыя ўмовы работы вытрымлівалі не ўсе. Заставаліся самыя таленавітыя. Ніводнае свята горада не абыходзілася без фотакінадакументалістаў Рагоўскага. І, як кажуць прафесіяналы, атрымліваўся такі якасны прадукт, што ў Мінску праяўлялі цікавасць.

Магілёўскі фотамастак Ірына Савосіна не была вучаніцай Рагоўскага, але, як аматарка гісторыі і краязнаўства, вывучыла ўсё, што датычыцца легендарнай па тых часах для Магілёва асобы.

— Гэта быў фантастычны чалавек, яго ўклад у фотокінематаграфічны рух Магілёўшчыны неацэнны, — кажа яна. — Да Рагоўскага гэтым ніхто не займаўся, былі асобныя фотааматары. Кінастудыя «Прамень» па тых часах наогул была першай у краіне. І рабілі на ёй фільмы не толькі дакументальныя, але і гульнявыя. На жаль, мала што з таго захавалася. Але тое, што ёсць, сведчыць аб высокім прафесіяналізме. Былі створаны нават курсы пры кінастудыі, дзе чыталі лекцыі майстры кіно з вялікай літары. Здараліся выпадкі, калі студыйцаў да сябе на работу запрашалі прафесійныя кінастудыі. Той жа Валерый Каралёў шмат гадоў працаваў на «Беларусьфільме», здымаў дакументальнае кіно. Узнагарод у кінастудыі пад кіраўніцтвам Рагоўскага было шмат. Калектыў рос і развіваўся. Трэба аддаць належнае і кіраўніцтву ДК чыгуначнікаў. Бо для такой справы патрабаваліся вялікія грошы. І яны выдзяляліся.

На пачатку 70-х мінулага стагоддзя Рагоўскаму прапанавалі ўзначаліць пры гарадскім Доме культуры новы фотаклуб «Вясёлка», а праз чатыры гады яго калектыў першы ў краіне атрымаў званне народны! Тут працавалі майстры высокага ўзроўню, такія як Зіновій Шэгельман, Павел Цішкоўскі і іншыя.

Сталічныя фатографы, у якіх магчымасцяў і прыхільнікаў было болей, звычайна ставіліся крыху паблажліва да перыферыйных. Але не да магіляўчан. Калі тыя прыязджалі са сваімі работамі на чарговы фестываль, усе здзіўляліся і ахалі: ну таленавіта ж! Магіляўчан ведалі, бо не было такіх саюзных выставак і фестываляў, куды б яны не даязджалі. Калі ў Магілёве сталі здымаць спачатку дакументальнае кіно, а потым гульнявое, пра гэту з'яву таксама загаварылі. Прозвішча Рагоўскага ведалі ў кінематаграфічных колах і ў Маскве, і ў Ленінградзе. У адным з яго фільмаў, дарэчы, зняўся



заслужаны артыст РСФСР Мікалай Радзівонаў. Ён прыехаў з жонкай з Ленінграда, пэўны час працаваў у Магілёўскім драмтэатры і быў членам фотаклуба «Вясёлка».

Адзін з таленавітых вучняў Рагоўскага Анатоль Мельнікаў прыйшоў у кінастудыю, калі вучыўся ў восьмым класе. Адам Арцёмавіч якраз шукаў героя на ролю глуханямога хлопчыка для першага свайго гульнявага фільма «Параненая кнігаўка». І Мельнікаў цудоўна справіўся са сваёй задачай. На кінафестывалі ў Мінску фільм быў адзначаны як адзін з найлепшых. А хутка Анатоль сам стаў здымаць фільмы і пісаць сюжэты.

— Рагоўскі адкрыў дарогу многім людзям да фотакінамастацтва, — кажа ён. — Аматарскія студыі — добрая школа самадзейнага мастацтва на месцах. Потым падобныя ўзніклі ў іншых гарадах вобласці: Крычаве, Бабруйску, Чавусах. Туды цягнуліся людзі, якія любілі кіно. А гэта быў адзін з прывабных відаў мастацтва ў той час. Магчымасць зрабіць кіно, няхай зусім маленькае, было сапраўдным шчасцем. І Рагоўскі даваў шанц.

Пасля адкрыцця кінастудыі Адам Рагоўскі амаль ужо і не фатаграфаваў. Кіно адымала шмат сіл і часу. Майстар узяў на сябе ўсю чарнавую работу, каб яго любімая справа развівалася. Тыя, каму пашчасціла працаваць разам з ім, кажуць, што база, якую ён стварыў, была вельмі перадавая. Здымка патрабавала добрай тэхнічнай падрыхтоўкі, а для праяўкі плёнкі патрабавалася сур'ёзная лабараторная работа. На ўсё, што забяспечвала якасць, грошы не шкадавалі. А тое, што нельга было купіць, прыдумвалі самі. Існавала праблема з накладаннем гуку на плёнку: магнітафоны давалі невялічкі гул, што было непрыемна для слыху. І магілёўскі гукааператар-самавучка Міхаіл Бабрэнка зрабіў прыстасаванне, якое забяспечвала максімальную якасць перадачы гуку.

Анатоль перажывае, што рух кінааматараў у Беларусі не ацэнены па заслугах, хоць іх было шмат і вельмі таленавітых. І Рагоўскі на іх фоне выглядаў фігурай вялікай і шматграннай разнастайнай. Яму прыходзілася быць і адміністратарам, і аператарам, і мастаком, і рэжысёрам адначасова. У яго ўсё гэта добра атрымлівалася, і да яго цягнуліся людзі. І самае каштоўнае тое, што назапашваўся ўнікальны фотакінематаграфічны матэрыял менавіта пра Магілёў.

— З падачы Рагоўскага да нас прыязджалі чытаць лекцыі такія майстры «Масфільма», як вядомы савецкі кінааператар Пётр Тэрпсіхораў, — расказвае Анатоль Мельнікаў. — Рагоўскі ўмеў дамаўляцца з чыноўнікамі і пераконваць, што гэта патрэбна. Адам Арцёмавіч, як чалавек шырокага погляду, бачыў недахопы тых работ, якія прысылаліся на абласны конкурс з раёнаў. І разумеў, што без прафесійнай школы добрых вынікаў не дабіцца. Так у Магілёве былі створаны двухгадовыя курсы рэжысёраў-аператараў. Настаўнікі прыязджалі на некалькі дзён, давалі майстар-класы, і вучні такім чынам удасканальвалі сваё майстэрства.

Рагоўскі быў патрабавальным майстрам, але ўсё гэта ішло толькі на карысць вучням. Анатоль Мельнікаў успамінае, што яго дакументальны фільм да 50-годдзя Магілёўскага аўтазавода высока ацаніла мінская камісія. Пачатковец праявіў зайздросную вынаходлівасць: знайшоў у архіве даваенныя кадры завода, сфатаграфаваў некаторыя з іх і ўманціраваў у плёнку. Атрымалася амаль фотахроніка. Нават невялікія хібнасці, якія ўзнікалі ў працэсе дэманстрацыі, яе не сапсавалі. За гэты фільм ён у Мінску атрымаў сваю першую ўзнагароду — хрустальную вазу. Эксперты сказалі, што гэта кіно, да якога няма чаго дадаць і выразаць.

На памяць ад настаўніка Мельнікаву застаўся бюст Шукшына. Прызнаецца, што ён падарыў яго за работу над кінастужкай «Параненая кнігаўка» ўжо шмат гадоў пасля. І гэта для Анатоля самая высокая адзнака.

Каля дваццаці фільмаў таго перыяду захавалася ў прыватнай калекцыі Аляксандра Рожына, які прыйшоў у фотаклуб «Вясёлка» ў пачатку 70-х шаснаццацігадовым юнаком.


План выпуска фильмов
на 1971 год

— На той момант я крыху займаўся фота і кіно, і першае ўражанне, якое атрымаў, калі апынуўся ў студыі, было захапленне, — успамінае ён. — Магілёў перыяду дзейнасці Рагоўскага можна было лічыць фатаграфічнай сталіцай. Я ставіўся з вялікай пашанай да тых майстроў, якія працавалі ў студыі. Іх фота бачыў у абласной газеце «Магілёўская праўда» і лічыў іх сапраўднымі шэдэўрамі. З пятага класа я вучыўся фатаграфаваць у гуртку ў Палацы піянераў. І мой кіраўнік заўсёды ставіў у прыклад Рагоўскага. Помню, як у класе дзявятым прыйшоў у ДК чыгуначнікаў прасіцца, каб і мяне ўзялі ў студыю. У мяне спыталіся, што я магу рабіць, і зладзілі такі экзамен, што я, які на той час умеў сяк-так фатаграфаваць і праяўляць плёнку, адчуў сябе поўным невукам. Але маё жаданне было такім вялікім, што мяне ўзялі. Пад кіраўніцтвам Рагоўскага асвоіў усе тонкасці справы і так палюбіў яе, што яна стала маёй любімай прафесіяй.

Аляксандр Рожын расказвае, што студыя ў год здымала каля пятнаццаці 10-20-хвілінных фільмаў. І многія з гэтых кінастужак адзначаліся на рэспубліканскіх і нават усесаюзных конкурсах. Рагоўскі клапаціўся не толькі пра тое, каб у Магілёў прыязджалі вялікія мэтры кіно, але і фарміраваў дэлегацыі са сваіх вучняў на семінары ў Маскву і Мінск.

— Ён быў вельмі добрым, калі казаць сучаснай мовай, менеджарам, — адзначае фотамастак. — Мог арганізаваць, сабраць, падаць вельмі прыгожа. І пад усё гэта выдзяляліся добрыя грошы. Дзяржава развівала фотакінамастацтва сур'ёзна. Толькі пад фотастудыю «Вясёлка» ў гарадскім Доме культуры было выдзелена памяшканне агульнай плошчай каля 200 метраў. Там была і лабараторыя, і гуказапіс, і мантажная. І да нас стаўленне вельмі паважлівае. Усё гэта натхняла, і ўвесь час хацелася ўдасканальвацца.

Змены прыпалі на пачатак 80-х. У 1982 годзе пры гарадскім Доме культуры адбылася апошняя творчая сустрэча Адама Рагоўскага, дзе ён даваў справаздачу і паказваў свае кіно. На жаль, той феерычны росквіт фотакінамастацтва ў Магілёве ўжо ішоў на спад. Апошнія гады жыцця майстра былі няпростымі. Падводзіла здароўе, ды і ў сям'і пачалася чорная паласа. Адзін за адным пайшлі з жыцця яшчэ зусім маладыя яго дачка і сын. Потым памерла жонка, а праз тры гады не стала і самога Адама Арцёмавіча. І вось які парадокс. Калі пра яго фота- і кінематаграфічнае мінулае інфармацыі дастаткова шмат, то пра асабістае жыццё вельмі мала. Ён увесь час быў захоплены справай, а вось пра сябе амаль не расказваў. Вядома толькі, што нарадзіўся ў вёсцы Русінка Магілёўскага раёна. Узнагароджаны медалём «За Перамогу над Германіяй». І ўсё. Але ў Магілёве ўжо ёсць ахвотныя даведацца пра карані майстра і аднавіць больш поўную версію яго біяграфіі. Адам Рагоўскі сыграў дастаткова вялікую ролю ў жыцці Магілёва. І гэта нагода для дасканалага вывучэння яго асобы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

Здароўе на талерцы

# Непажаданы пропуск

## Знойдзена сувязь паміж адсутнасцю сняданку і рызыкай дэменцыі



**Японскія навукоўцы ўстанавілі, што пропуск ранішняга прыёму ежы павялічвае рызыку развіцця дэменцыі. Вынікі даследавання апублікаваны ў часопісе Japanese Journal of Human Sciences of Health-Social Services.**

Так, спецыялісты на працягу шасці гадоў назіралі за 525 людзьмі ва ўзросце за 65 гадоў. Навукоўцы прыйшлі да высновы, што дэменцыя сустракалася ў чатыры разы часцей у тых, хто грэбаваў сняданкам. Пры гэтым узрост і пол не мелі значэння.

У ходзе даследавання таксама ўдалося выявіць небяспеку хуткіх перакусаў замест паўнацэннага прыёму ежы. Было ўстаноўлена, што такая шкодная звычка павялічвае рызыку набытай непаўнацэннасці ў 2,7 раза. Не менш шкодным з'яўляецца і празмернае ўжыванне солі, а таксама адсутнасць збалансаванага рацыёну.

Тэхналогіі будучыні

# Уключыць актыўныя гены

## Распрацавана методыка па амаладжэнні клетак скуры на 30 гадоў

**Яе вынайшлі брытанскія навукоўцы. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні прэс-службы Інстытута Бабрэма.**

Адзначаецца, што першыя даследаванні па магчымым уключэнні генаў, якія адказваюць за дзейнасць ствалавых клетак, для амаладжэння арганізма чалавека былі праведзены яшчэ ў 2016 годзе на мышах, якія пражылі на 20 працэнтаў даўжэй дзякуючы падобнаму метаду.

Навуковы супрацоўнік інстытута Дзілджыт Гіл і яго калегі выкарыстоўвалі гэты падыход для выбарчага амаладжэння культур клетак скуры, вынятых з цела пажылых людзей і мышэй. Была распрацавана спецыяльная сістэма, якая дазваляе часова актываваць чатыры ключавыя гены MYC, OCT4, SOX2 і KLF4, што адказваюць за рост эмбрыянальных ствалавых клетак.

Для яе тэсціравання навукоўцы сабралі ўзоры клетак некалькіх добраахвотнікаў узростам у 38 і 53 гады, частка з якіх пакутавала ад хранічных захворванняў.

У выніку даследаванняў высветлілася, што такая методыка амаладзіла культуры клетак скуры на 10—30 гадоў у залежнасці ад таго, наколькі доўга заставаліся актыўнымі ключавыя гены.

Па словах даследчыкаў, гэтая працэдура не толькі прымусіла клеткі скуры выпрацоўваць больш калагену і іншых бялкоў, а так-



сама больш інтэнсіўна дзяліцца і перасоўвацца па культуры, прыкметна паўплывала на актыўнасць участкаў ДНК, звязаных з развіццём старэчых хвароб, у прыватнасці хваробы Альцгеймера і катаракты вока.

«Нашы даследаванні сталі вялікім крокам наперад у вывучэнні феномену рэпраграмавання клетак. Мы даказалі, што клеткі можна амаладзіць без страты імі іх спецыялізацыі, а таксама паказалі, што гэтая працэдура аднаўляе частку страчаных функцый. Асабліва шматспадзеўным выглядае тое, што амаладжэнне прывяло да зніжэння актыўнасці генаў, звязаных са старэчымі хваробамі», — падкрэсліў Гіл.

Навукоўцы спадзяюцца, што іх распрацоўка значна прасуне чалавецтва да вырашэння праблемы амаладжэння арганізма пажылых людзей.

Каго мы бачым!

# Цуд трапічнага лесу

## Неонава-аранжавы колер супраць высечак

**У перадгор'і Анд, у Эквадоры, зноў выявілі трапічную дзікую кветку, якую доўгі час лічылі вымерлай. Вынікі даследавання апісаны ў часопісе PhytoKeys.**



Шырокая высечка лясоў у заходнім Эквадоры ў канцы мінулага стагоддзя прывяла да знікнення шэрагу відаў раслін, у тым ліку меркавалася, што знік і Gasteranthus extinctu. Нягледзячы на інфармацыю аб высечцы больш за 97 працэнтаў лясоў у заходняй палове Эквадора, даследчыкі вырашылі вывучыць тэрыторыю мінулым летам, пачаўшы са спада-рожнікавых здымкаў, каб ідэнтыфікаваць некранутыя першасныя трапічныя лясы. Паўднёва-амерыканская кветка Gasteranthus extinctus была знойдзена ў невялікіх лясных зонах у рэгіёне Сенцінела ў Эквадоры праз 40 гадоў пасля яе апошняга назірання.

Трапічная кветка характарызуецца пялёсткамі неонава-аранжавага колеру і вялікім ніжнім мяшком, куды могуць залятаць і вылятаць апыляльныя казуркі.

Біялогія з анатоміяй

# Прыстасаванне для выжывання



## Навукоўцы выпадкова выявілі рэдкую здольнасць кальмара

**Даследчыкам вядома, як васьміногі і каракаціцы ўмеюць маскіравацца пад колеры навакольнага асяроддзя або грунт, каб схавацца ад драпежнікаў. Пра такую ж здольнасць у кальмараў даведаліся спецыялісты аддзела фізікі і біялогіі Акінаўскага інстытута навукі і тэхналогій, якія правялі шэраг эксперыментаў.**

«Калі авальныя кальмары знаходзіліся ў частцы акварыума з чыстай вадой, яны былі светлага колеру, але калі траплялі ў частку з водарасцямі, станавіліся цямнейшыя. Навукоўцы падкрэслілі, што, апроч магчымасцяў для вывучэння новых здольнасцяў кальмараў, даследаванне раскрывае яшчэ невядомую навуцы прыстасаванасць іх для выжывання», — паведамляецца на сайце інстытута.

Па словах доктара Руты Накадзімы, запрошанага даследчыка, кальмары звычайна жывуць у адкрытым акіяне, але навукоўцам было цікава высветліць, што адбываецца, калі яны набліжаюцца да каралавага рыфа або калі іх пераследуе драпежнік на дне акіяна.

«Калі здольнасць мімікрыраваць важная для кальмараў пры сустрэчы з драпежнікам, гэта паказвае на тое, што павелічэнне або памяншэнне папуляцыі кальмараў залежыць ад здароўя каралавых рыфаў значна больш, чым мы думалі», — сказала доктар Накадзіма.

Здольнасць кальмараў мяняць колер была выяўлена выпадкова. На марской навуковай станцыі інстытута даследчыкі чысцілі рэзервуар для марскіх жывёл, каб вызваліць нарослыя водарасці. Яны заўважылі, як кальмары мянялі колер, знаходзячыся ў вычышчанай вадзе ці плаваючы над водарасцямі. Кантрольны эксперымент даказаў, што кальмары сапраўды ўмеюць мяняць колер у залежнасці ад навакольнага асяроддзя.

Пласты гісторыі

# Містыфікацыі муміфікацыі

## Археолагі адкапалі таемную грабніцу старажытнаегіпецкага палкаводца



**Ён кіраваў войскам замежных наймітаў. Пра гэта паведамляе Newsweek. Па словах навукоўцаў, егіпецкі ваенны чыноўнік Вахібры-меры-Нейт адказваў за вярбоўку салдат з Малой Азіі і з астравоў Эгейскага мора.**

Грабніца датуецца пачаткам V стагоддзя да н. э. Унутры яе археолагі выявілі найбуйнейшы ў Егіпце склад бальзаміравання, у якім знаходзілася 370 керамічных збаноў з матэрыяламі, выкарыстанымі для муміфікацыі палкаводца.

Каманда таксама даследавала шахтавую грабніцу старажытнага саноўніка памерам каля 14 на 14 метраў, а глыбінёй каля 16 метраў. На дне шахты навукоўцы выявілі падвойны саркафаг, пашкоджаны марадзёрамі V стагоддзя.

Вонкавы пласт саркафага зроблены з двух гіганцкіх блокаў вапняку з дэкаратыўнай унутранай труной у форме чалавека. На труне нанесены надпісы з Кнігі Мёртвых і апісаны ўваскрашэнне палкаводца і падарожжа ў замагільны свет.

Характэрна, што археолагі не знайшлі мумію палкаводца, але знайшлі дзве драўляныя скрыні з 402 глінянымі фігуркамі, створанымі для таго, каб служыць яму ў замагільным свеце.

Меры засцярогі

# Шчаціннe з інфекцыяй

## Медыкі раскрылі небяспеку пэндзляў для макіяжу

**Урачы англійскай клінікі Aventus, якая спецыялізуецца на перасадцы валасоў і дэрматалогіі, раскрылі небяспеку інструментаў для нанясення касметыкі. Адпаведны матэрыял прыводзіць выданне Daily Mail.**

Спецыялісты даследавалі пад мікраскопам 12 пэндзляў для макіяжу і выявілі, што 11 з іх аказаліся бруднейшымі за сядзенні ўнітаза і былі заражаныя цвіллю, грыбкамі і бактэрыямі. Пры гэтым медыкі назвалі найбольш небяспечнымі сродкі для нанясення ценяў і румян. Акрамя таго, супрацоўнікі клінікі пратэсціравалі бляскі для вуснаў, выявіўшы на кожным з іх 4364 калоніі дражджэй і бактэрый. Даныя праведзенага эксперыменту яны падмацавалі адпаведнымі фатаграфіямі паказаных прылад.

«Нават пасля таго, як чалавек упершыню скарыстаецца пэндзлем для макіяжу, на ім ужо будуць утварацца калоніі хваробатворных мікраарганізмаў. Пры штодзённым выкарыстоўванні гэтыя прылады збіраюць бруд, тлушч і змярцвелыя клеткі скуры. У сваю чаргу тыя служаць пажыўным асяроддзем для бактэрый, якія могуць прывесці да высыпанняў і раздражненняў скуры. Калі забруджаны пэндзаль трапіць у вочы, гэта можа выклікаць інфекцыі або алергічныя рэакцыі, аднак пазбегнуць гэтай шкоды можна з дапамогай штотыднёвай працэдуры чысткі», — адзначыў доктар Сухайл Алам.



Акрамя таго, ён расказаў, як правільна мыць сродкі для нанясення макіяжу. Так, трэба намыліць пэндзаль прыдатным сродкам для ачышчэння скуры, старанна памасіраваць шчаціннe ў далоні, прамыць цёплай вадой, а затым сціснуць, каб выдаліць лішкі вільгаці.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**






# ГІСТОРЫЯ Ў ЦЭГЛЕ

**ЗВЫЧАЙНАЯ будаўнічая цагліна можа стаць сведкай розных эпох і нават удзельніцай гісторыі, красамоўна распавядзе пра горад альбо вёску, дойлідства, будоўлю, гліну і агонь, цагельню і работу майстра. Гэта стане магчымым, калі яна, цагліна, трапіць у поле зроку жыхара Бешанковіч Станіслава ЛЕОНЕНКІ — мясцовага радзімазнаўца і апантанага калекцыянера. Цэгла для Стаса — не проста будматэрыял, а ў першую чаргу каштоўны артэфакт і нават цэлы сусвет.**

За пяць гадоў з таго часу, калі Стас сур'ёзна захапіўся вывучэннем і высвятленнем паходжання штучнага каменнага матэрыялу, праз яго рукі прайшло сотні цаглін, але толькі адзінкі — са сваімі асаблівасцямі і біяграфічнымі данымі — сталі ўзорамі культурна-гістарычнага значэння. Гэтыя ўнікальныя знаходкі натхнілі яго стварыць першы на абшарах краіны музей цэглы. Наведвальнікам у музейнай экспазіцыі выстаўлена невялікая частка артэфактаў, а асабліва каштоўныя захоўваюцца ў так званым фондзе — у зачыненай гаспадарчай пабудове. Тут на кожную цагліну заведзены пашпарт з навуковымі запісамі: адкуль прывезена, з якой пабудовы, памер, даты і сведчанні відавочцаў. Свае артэфакты ён знаходзіць у вёсках, якія знікаюць альбо ўжо зніклі: на месцах дамоў і гаспадарчых пабудоў, на пячных крушнях, на рэштках касцёлаў, цэркваў і панскіх сядзіб. І нават на месцах спаленых падчас вайны населеных пунктаў. Усе гэтыя мясціны ў акрузе Бешанковіч, Ушач, Лепеля, Чашнікаў. Сёлета, падчас рэстаўрацыі палаца Храптовічаў у Бешанковічах, Стас папоўніў калекцыю цаглінамі XVIII стагоддзя. Цэгла выраблялася ў мясцовай цагельні, пабудаванай яшчэ Міхаілам Храптовічам, — кожная адзінка мела сваё фірменнае кляймо. Калі сталі чысціць сажалку ў старым парку, дапытлівы бешанковец падняў цэглу дзіўнай формы, аналага якой не знайшоў у даведніках і старой літаратуры. Наогул, самыя старыя экзэмпляры ў Стасавай калекцыі — трохсотгадовыя цагліны, так званага пятроўскага стандарту — 30 сантыметраў у даўжыню, 16 сантыметраў у шырыню і восем сантыметраў у таўшчыню. Такую цэглу называлі двухручнай, бо бралі яе толькі дзвюма рукамі.

А яшчэ ў запасе калекцыянера маюцца іншыя, не менш цікавыя дзяржаўныя стандарты. У сярэдзіне XIX стагоддзя ў Расійскай імперыі ўстанавілі адзіны стандарт памераў: шэсць вяршкоў — тры вяршкі — паўтара вяршка. У савецкі час, у 1927 годзе, увялі новы будаўнічы стандарт: 25 см х 12 см х 6 см, які функцыянуе і да сёння.

Гаспадар музея — найцікавейшы апавядальнік, ён абавязкова распавядзе і пра цагліны-«пальчаткі», і пра адбіткі воўчай лапы (своеасаблівы ўзор абярэга), і пра «аўтографы» на цаглінах. Больш за ўсё цаглін з кляймом. Напрыклад, літара «б» азначала, што цэглу выраблялі ў Бешанковічах, нумарамі «11», «32», «33» кляймілі ў віцебскіх цагельнях.

— Збіранне цэглы зрабіла мяне дасведчаным і ў краязнаўстве, — кажа калекцыянер. — Гледзячы на цэглу, я магу распавесці гісторыю той ці іншай вёскі. А яшчэ мару, каб калі-небудзь узвялі помнік зніклым вёскам з цаглін маёй вялікай калекцыі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
**Больш здымкаў на zviazda.by**











## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Каток дорожный CATERPILLAR CS-563E (рег. знак КА-7 0688), 2007 г. в. | 63 360,00 | 6336,00 | 3168,00 |
| 2 | Каток дорожный Bomag BW154 AP (рег. знак КА-7 4513), 2011 г. в. | 62 112,00 | 6211,20 | 3105,60 |
| 3 | Автокран МАЗ 6303 (рег. знак АА 8872-7), 2006 г. в. | 30 816,00 | 3081,60 | 1540,80 |
| 4 | Автомобиль Volkswagen LT35 (рег. знак АА 6857-7), 2002 г. в. | 5376,00 | 537,60 | 268,80 |
| 5 | Автомобиль МАЗ -6516С9-520-000 (рег. знак АС 5465-7), 2019 г. в. | 83 616,00 | 8361,60 | 4180,80 |
| 6 | Вилочный погрузчик ЕВ 687.22 (инв. № 1163), 2008 г. в. | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 7 | Вилочный погрузчик CPCD25DT (инв. № 1554), 2009 г. в. | 13 728,00 | 1372,80 | 686,40 |
| 8 | Прицепная установка для приготовления битумных дорожных строительных смесей СБ-500 (инв. № 3065), 2019 г. в. | 67 584,00 | 6758,40 | 3379,20 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.**
Ранее публикация о торгах размещалась в газете Звязда № 126 (29748) от 30.06.2022, стр. 10, № 159 (29781) от 16.08.2022

**Местонахождение лота № 1:** ОАО «Минский тракторный завод» (г. Минск, ул. Долгобродская, 29); **лота № 2:** РУП «Белмедпрепараты» (г. Минск, ул. Маяковского 1); **лота № 4:** аг. Сенница, ул. Парковая, 1; **лотов №№ 3, 5, 6, 8:** Боровляны, пос. Опытный, ул. Лагерная, 20, **лота № 7:** Боровляны, ул. 40 лет Победы, 19а

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **20 сентября 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 7 сентября 2022 года до 16.00 16 сентября 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», проводимых 20.09.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375173515452, +375293396845, e-mail: pc-bel@tut.by (220090, г. Минск, улица Широкая, д. 4, УНП 600013209)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 11 октября 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-38833** общей площадью **4 241,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания транспортного цеха** (составные части и принадлежности: А-Автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием**). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа». **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1)**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9 | **306 000,00** | 15 300,00 |

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 797-88-07 – заместитель директора по техническим вопросам Галактионов Виктор Владимирович.

**Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 7 сентября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

